ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух")
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—60 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьвыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбавкі.

Падпісна і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-86
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

СЕРАДА, 14 мая 1930 г.
№ 111 (3709)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Партыя рыхтуецца да свайго зьезду

Усёй нашай партыяй разгортваецца шырокая падрыхтоўка да XIII зьезду ВКП(б)Б. У арганізацыях пачаліся раньняя канфэрэнцыі, бліжэйшымі днямі адкрываецца рад акруговых партканфэрэнцый.

Партыйныя канфэрэнцыі прахо[illegible]ць пры бясспрэчна павышанай актыўнасьці партыйных мас. Арганізацыі партыі з надзвычайнай жвавасьцю абмяркоўваюць актуальныя пытаньні партыйнай палітыкі. Спрэчкі, якія разгортваюцца, праходзяць пад знакам крытыкі і сапраўды бальшавіцкай самакрытыкі.

Ужо першыя вынікі падрыхтоўчай работы да зьезду гавораць аб тым, што лязо бальшавіцкай самакрытыкі, накіравана на актыўную абарону генеральнай лініі партыі, за сапраўднае выкананьне памылак, і за рашучае іх прадаўленьне, супроць атак на парэшткі кіраўніцтва, супроць хістаньняў, супроць ухілаў ад лініі партыі.

У цэнтры ўвагі партыйных канфэрэнцый, як і ўсёй партыі, стаяць пытаньні барацьбы за генэральную лінію партыі, супроць усякіх ухілаў ад гэтай лініі. Барацьба па два франты—супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі і «левых» загібаў, «левых» скрыўленьняў партыйнай лініі і прымірэнцтва да іх чырвонай шкадай праходзіць у работах канфэрэнцый. Падагульваючы вынікі той ці іншай барацьбы, якая праведзена нашай КП(б)Б за ўвесь пэрыяд ад X зьезду супроць ухілаў ад лініі партыі, перш за ўсё, супроць правага апартунізму ў тэорыі і практыцы, супроць нацыянал-дэмакратызму і нацыянал-апартунізму, трэба прызнаць, што да XIII зьезду партыя падыходзіць з бязумоўнымі посьпехамі ў гавоце бальшавіцкі сваіх радоў. Барацьба з прынцыпіальнай, пасьпяховая і аднадушная барацьба з бухарынскай правай апазыцыяй, рашучая непрымірымая барацьба, якую праводзіла наша партыя з шавінізмамі і з бурсуазным нацыянал-дэмакратызмам, нацыянал-апартунізмам, як галоўнай небясьпекаю для сучаснага пэрыяду, барацьба з апартуністычнымі скажэньнямі лініі партыі ў сампрамках працы і г. д. — усё гэта сур'ёзныя крокі на шляху ўпартай і пераможнай барацьбы нашай партыі за бальшавіцкую лінію.

Зразумела, што ў цэнтры ўвагі прадканфэрэнцый стаяць пытаньні калектыўнага будаўніцтва і тых буйных паспяхах, якія былі зроблены ў гэтай галіне і ў нас, на Беларусі. Партыйныя арганізацыі паддаюць жорсткай критыцы і самакрытыцы тыя «левыя» загібы і скажэньні лініі партыі, які меліся ў калгасным будаўніцтве і ўяўляліся галоўнаю прычынаю таго адліву з калгасаў, які назіраецца і ў нас, у БССР. Канфэрэнцыі з усёй яскравасьцю яшчэ раз паказваюць, што там, дзе арганізацыі на дырэктывах ЦК УсеКП(б), пасьля артыкулаў т. Сталіна, адразу сталі на шлях выпраўленьня памылак, там мы маем найбольш посьпехаў у галіне замацаваньня дасягнутага. Там-жа, дзе замест самакрытыкі было супраціўленьне дырэктывам партыі, там, дзе замест выпраўленьня перагібаў, паасобныя элемэнты партыі паддаліся паніцы, там якраз назіраецца найбольшы процант адліву з калгасаў.

Канфэрэнцыі паказваюць, што наша партыя паогул, у сваёй асноўнай масе, пасьпяхова перамагае труднасьць, якая заключалася ў тым, каб хутка перабудаваць свае рады, каб выправіць памылкі і ўзяцца па-бальшавіцку за арганізацыйна-практычную работу ў калгасах, за бальшавіцкую сяўбу.

Партыя з усёй сілай і рашучасьцю б'е на «левых» загібах і па прымірэнцкіх адносінах да іх. Яна праяўляе вялізарнейшую непрымірымасьць у справе поўнага і канчатковага прызнаньня ўсіх мэўшыхся памылак, для таго, каб на гэтых памылках выхоўваць і вучыць нашы партыйныя кадры. Але адначасова, як мы бачым, партыя не дазволіць праваапартуністычным элемэнтам мабілізавацца для барацьбы з лініяй партыі, для рэвізіі гэтай лініі, для дыскрэдытацыі партыйнага кіраўніцтва.

Канфэрэнцыі, якія зараз адбываюцца, з надзвычайнай выразнасьцю паказалі правільнасьць палажэньняў, высунутых у артыкуле т. Сталіна аб тым, што «левыя» загібы і супраціўленьне ў справе іх выпраўленьня ўзмацняюць пазыцыі правага апартунізму ў нашай партыі. «Левыя» загібы падаюць партыйную лінію ў скажаным сьвятле, яны дыскрэдытуюць нашу лінію і партыйнае кіраўніцтва, а дыскрэдытацыя партыйнага кіраўніцтва, як гэта зазначыў тав. Сталін, зьяўляецца лепшай глебай для правых апартуністых. КП(б)Б, загартаваная ў баёх за бальшавіцкую лінію, і ў даным выпадку будзе ў першых радох актыўных барацьбітоў за ленінскую палітыку, за ленінскі ЦК УсеКП(б).

Пад кіраўніцтвам свайго Цэнтральнага Камітэту, адзінай і згуртаванай КП(б)Б падыдзе да свайго XIII зьезду. Разгортваючы самакрытыку, узмацняючы барацьбу з ухіламі ад генэральнай лініі партыі, даючы адпор вылазкам супроць гэтай лініі справа і «зьлева», наша арганізацыя будзе пасьпяхова выконваць тыя адказныя задачы, якія стаяць перад ёю ў справе кіраўніцтва шырокімі масамі працоўных і сацыялістычным будаўніцтвам.

На 10 мая Мазыршчына засеяла 52,2% яравога кліну

Полацкая акруга абагнала Аршанскую

ТЭМП СЯЎБЫ ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР УСЁ ЯШЧЭ НЕДАСТАТКОВЫ

СЯЎБА У БУЙНЫМ ІЛЬНАВОДНЫМ САЎГАСЕ „БОРКАВІЧЫ"

З прычыны дрэннай арганізацыі, плян сяўбы скарачаецца на палову

Карчы, хмызьняк, балотцы — і зноў тое самае. Вельмі рэдкія палянкі, засеяныя жытам. І так па плошчы ў 7.467 гэкт. Тут арганізуецца першы ў БССР буйны ільнаводны саўгас «Беркавічы».

Гледзячы на гэты малюнак, прыходзіш да думкі, што прайшла-б яшчэ добрая сотня гадоў, а сялянскія дворыкі, якіх тут налічваецца каля 300 (гэта на плошчы ў 7-8 тыс. гэкт.) ніколі-б не абрабілі гэтае вялізарнае плошчы.

Кіраўніком саўгасу дана заданьне асвоіць да будучай вясны 1.900 гэкт. Ці выканаюць? Так, Бо не працавала-б зараз на 700 рабочых у гэтым хмызьняку. Работнікі ўпэўнены, што падымуць вызначаную плошчу цаліны, калі трактары прыбудуць з пязначным спазьненьнем. Такое ўпэўненасьці няма, нажаль, у адносінах поўнага выкананьня пляну веснавой сяўбы.

Сёлета сеюць 400 гэкт. ільну. Насеньне — гатунковае. Угнаеньня хапае.

Будаўніцтва гэтага вялізарнага саўгасу сутыкаецца аднак, з радам ненармальнасьцяй, з якімі не вялзецца належнай барацьбы.

Возьмем, напрыклад, такія факты.

Партыйна - савецкія ўстановы раёну і акругі яшчэ да гэтага часу не паклапаціліся мабілізаваць увагу мясцовага сялянства наўкола пытаньняў будаўніцтва саўгасу. Яны не прынялі належных мер, каб бяз усякіх канфліктаў задаволіць тых, інтарэсы якіх у сувязі з разгортваньнем працы ў саўгасе, закранаюцца.

Саўгас не забясьпечан патрэбнай колькасьцю спэцыялістых.

Трэба заараць новыя, яшчэ неапляценыя карэньнямі, 450 гэкт. над лён і авёс. А цягавай сілы ў саўгасах сваіх — усяго 27 коняй.

Да кожнага цятніка выходзяць. Усё чакаюць трактараў. А іх няма. Трактарыстыя ўсе знаходзяцца ў саўгасе.

Раней меркавалі засеяць 1.000 гэкт. У сувязі з адсутнасьцю цягавай сілы, скарацілі пасеўную плошчу да 450 гэкт. «Цэнтравікі», аднак, усё роўна плошць пасеньне і ўгнаеньне, выходзячы з пасеўнай плошчы ў 1.000 гэкт. Багоны з угнаеньнем прыходзяць на станцыю Боркавічы і... неразгружанымі адпраўляюцца назад.

Брыгадзір «Зьвязды» КЛІМАЎ.

Скончылі сяўбу, выканалі плян

СЛУЦАК. (ПА ТЭЛЕГРАФУ АД НАШ. КАР.). КАЛГАСЫ «КОЛАС» 1 «ЧЫРВОНЫ ПРАЦАЎНІК» ПОЎНАСЬЦЮ СКОНЧЫЛІ СЯЎБУ, ВЫКАНАЎШЫ ПЛЯН.

КАЛГАС «КОЛАС» ПРЫСТУПІЎ ЗАРАЗ ДА АПРАЦОЎКІ І ЗАСЕВУ, ПУСТУЮЧАГА Ў СЕЛЬСАВЕЦЕ ВУЧАСТКУ ЗЯМЛІ.

КАРАЧУН.

СТАРЫЯ ДАРОГІ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). 10-га МАЯ СКОНЧЫЛІ СЯЎБУ КАЛГАСЫ «МАЙ», «НОВЫ СЕЛЯНІН» І ІМЯ ДЗЕСЯЦІГОДЗЬДЗЯ КАСТРЫЧНІКА.

СТАРАДАРОСКІ РАЙПАЛЯВОДСАЮЗ.

Апэрацыйныя зводкі

АРШАНСКАЯ АКРУГА

ВОРША. На 10 мая калгасы Аршанскай акругі засялі 9.245 гэктараў, што складае 20,8 проц. пасеўнага пляну калгасамі выкананы плян на 23,3 проц., па тэхнічных культурах — на 5,6 проц., па бульбе — на 11 проц., па аднагадовых травах (віцы і сэрадэлі)— на 42,7 проц., канюшыне — 30,3 проц. і іншых культурах — 10,7 проц.

Індывідуальным сэктарам засеяна 36.634 гэкт. — 15,4 проц. пляну. Па збожжавых культурах плян выкананы на 16,3 проц., тэхнічных культурах — на 5,3 проц., бульбе — на 14,8 проц., аднагадовых травах — на 19,9 проц., канюшыне — на 34,5 проц. і іншых культурах — 6,7 проц.

Усяго на абодвых сэктарах засеяна 45.879 гэкт., што складае 16,3 проц. агульнага пасеўнага пляну па акрузе. Па асобных культурах агульны плян выкананы наступным чынам: па збожжавых культурах—на 17,2 проц., тэхнічных культурах — на 5,3 проц., бульбе— на 14,2 проц., аднагодных травах — на 23,8 проц., канюшыне—на 32,9 проц., і іншых культурах — на 7,4 проц.

Полацкая акруга

ПОЛАЦАК. Калгасамі Полацкай акругі на 10 мая засеяна 9804,5 гэкт., што складае 29,8 проц. пляну. Індывідуальнымі гаспадаркамі засеяна 21354 гэкт.— 17 проц. пляну. Усяго па абодвых сэктарох засеяна 31158 гэкт. Агульны плян засеву выкананы на 19,7 прсц.

Калі ўзяць па асобных культурах, дык атрымаецца такі малюнак: па збожжавых культурах плян выкананы калгасамі на 25,4 проц., індывідуальным сэктарам — на 19,9 проц.; па тэхнічных культурах — калгасамі — на 0,8 проц., індывідуальным сэктарам—на 08 проц.; па бульбе — калгасамі на 20,1 проц., індывідуальным сэктарам на 22,1 проц.; па аднагадовых травах — калгасамі на 31,8, індывідуальным сэктарам—на 24,3 проц.; па канюшыне — калгасамі — на 87,7 проц., індывідуальным сэктарам— на 29,5 проц. і па іншых культурах — калгасамі — на 15,4 проц., індывідуальным сэктарам — на 5,5 проц.

З гэтай зводкі відаць, што індывідуальны сэктар па большасьці культур значна адстае ад калгасаў. Калгасы-ж з свайго боку адстаюць з сяўбой бульбы і тэхнічных культур.

У сярэднім, па абодвух сэктарох плян выкананы: па збожжавых культурах — на 20,9 проц., тэхнічных культурах — на 0,8 проц., бульбе — на 21,7 проц., аднагадовых травах — на 26,7 проц., канюшыне — на 53,7 проц. і іншых культурах — на 7,4 проц.

Мазырская акруга

МАЗЫР. Па Мазырскай акрузе на 10 мая засеяна 75.000 гэкт., што складае— 52,7 проц. пасеўнага пляну. Калгасамі засеяна 16.873 гэкт. (58,2 проц. пасеўнага пляну калгасаў), індывідуальным сэктарам — 58,127 гэкт. (51,3 проц. пляну).

Па збожжавых культурах калгасы далі 76,3 проц. пляну, тэхнічных культурах — 55,4 проц., бульбе — 34 проц., аднагадовых травах (віцы і сэрадэлі) — 58,5 проц., канюшыне — 92 проц. і іншых культурах — 40 проц.

Індывідуальны сэктар даў па збожжавых культурах 54% пляну, па тэхнічных культурах — 56,3 проц., бульбе — 54,6 проц., аднагадовых травах — 32,9 проц., канюшыне — 89 проц. і іншых культурах — 16,4 проц.

У сярэднім абодва сэктары далі: па збожжавых культурах 57 проц. пляну, тэхнічных культурах—56,2 проц., бульбе — 50,6 проц., аднагадовых травах— 42,2 проц., канюшыне — 69,8 і іншых культурах — 21,9 проц.

ЗАМЕЖНЫЯ ГЛЕБА-ФРЭЗЫ НЕ СКАРЫСТОЎВАЮЦЦА

У «Зьвязьдзе» ў свой час наведамлялася, што Менакрза на працягу некалькіх тыдняў не выкупляў замежныя глеба-фрэзы.

Пасьля надрукаваньня гэтай заметкі глеба-фрэзы былі выкуплены і паслаты ў садова-гародню базу «Зацішша» (Самахвалавіцкі раён, Менскае акругі) і на лясную дасьледчую станцыю Вяляцінскага лясьніцтва, Барысаўскага раёну.

Прайшло ўжо тры тыдні, а глеба-фрэзы ўсё яшчэ не скарыстоўваюцца. Гэта здарылася з тае прычыны, што Наркамзем, хаця і выпісаў гэтыя новыя машыны для апрацоўкі гародняй зямлі, але забыў падрыхтаваць кадры, якія-б змаглі працаваць на глеба-фрэзах.

Такім чынам, глеба-фрэзы сёлета скарыстаны быць ня могуць.

Хто адкажа за гэту ганебную справу?

М. С.

Поўны провал ППС і яваро ўшчыкаў на выбарах у Верхня-Сілескі сойм

ЗА РАБОЧА - СЯЛЯНСКІ СЬПІСАК ПАДАНА БОЛЬШ ГАЛАСОЎ, ЧЫМ У 1928 Г.

ВАРШАВА, 12. 11-га мая адбыліся выбары ў Верхня-Сілескі сойм. Выбары праходзілі ў выключна напружанай абстаноўцы: пілсудчыкі кінулі на выбарную кампанію вялізныя грашовыя сродкі і вялікі лік агітатараў. На пілсудчыкаў працаваў увесь дзяржаўны апарат на мясцох. Левы рабоча-сялянскі блёк перадвыбарнай кампаніі падпадаў нячуваным рэпрэсіям. Усе без выключэньня кандыдаты блёку перад выбарамі былі арыштаваны. У выніку выбараў ППС траціць у параўнаньні з папярэднімі выбарамі 50 проц. мандатаў і яшчэ больш процант галасоў. Яваро ўшчыкі, для якіх Верхняя Сілезія зьяўлялася адзіным цэнтрам упліву, з трэскам праваліліся, не атрымаўшы ні аднаго мандату. Разгром ППС у Верхняй Сілезіі становіцца асабліва відавочным, калі разгледзець вынікі галасаваньня па кожным з усіх 3-х выбарчых раёнаў. ППС атрымала 4 мандаты выключна таму, што ў першай (сялянскай) акрузе яна сабрала 30.000 галасоў. У другой (прамысловай) акрузе ППС атрымала 8.000 галасоў, тады як левы рабоча-сялянскі сьпісак сабраў 11.000. У трэцяй — прамысловай акрузе — Каралеўская гута, за ППС падана 8.000 галасоў, тады як рабоча-сялянскі сьпісак сабраў каля 20.000. Лічбу галасоў, паданых за рабоча-сялянскі сьпісак устанавіць яшчэ нельга; бясспрэчна, што яна значна перавышае лік галасоў, атрыманых імі на выбарах у сойм 1928 г.

Моцнае паражэньне атрымалі пілсудчыкі. 22-м мандатам апазыцыйных польскіх партый у Верхня-Сілескім сойме супрацьстаіць усяго 10 мандатаў пілсудчыкаў. Выбары выявілі значны посьпех апазыцыі. Самы заядлы супраціўнік пілсудчыкаў у Верхняй Сілезіі Карфанты, пасьля майскага перавароту амаль зышоўны са сцэны, зараз уваходзіць у Верхня-Сілескі сойм у якасьці кіраўніка мацнейшай фракцыі.

Для сучасных выбараў характэрны рост ліку нямецкіх мандатаў у Верхняй Сілезіі, праўда, павялічэньне пязначнае — толькі на адзін мандат. У першай (сялянскай) выбарчай акрузе, за нямецкі сьпісак падана 53 проц. усіх галасоў. У дзьвёх апошніх акругах немцы атрымалі больш 40 проц. усяе колькасьці паданых галасоў.

АМЭРЫКАНСКІ ДЗЕЛАВЫ СЬВЕТ—

ЗА ДАЛЕЙШАЕ РАЗГОРТВАНЬНЕ САВЕЦКА-АМЭРЫКАНСКІХ ГАНДЛЕВЫХ АДНОСІН

НЬЮ-ЁРК, 12. 17 красавіка адбылася, арганізаваная палатаю нацыянальных прамысловых канфэрэнцый, канфэрэнцыя па пытаньні аб савецка-амэрыканскіх адносінах.

На канфэрэнцыі прысутнічала 150 чалавек, у большасьці свае відныя прадстаўнікі дзелавога сьвету. Прадстаўнікі друку на канфэрэнцыю дапушчаны ня былі.

Паводле атрыманых карэспандэнтам ТАСС вестак, з 5 дакладчыкаў, выступаўшых на канфэрэнцыі, трое зьяўляюцца чыноўнікамі розных міністэрстваў. Другія два былі — вядомы хлебапрамыслоўца Кэмпбэль і вядомы дзеяч у галіне асьветы Джордж Каунтс. які нядаўна наведаў СССР.

Кэмпбэль у сваёй прамове заявіў, што, па яго думцы, руху калектывізацыі ў СССР забясьпечаны посьпех. Каунтс хваліў настаноўку справы асьветы ў СССР.

Прамовы чыноўнікаў мелі мэты прызязны характэр. Начальнік аддзяленьня мясцовай інфармацыі міністэрства гандлю заявіў, што «пяцігодка прадстаўляе сабой скарэй палітычную, чым эканамічную праграму». Малодшы чыноўнік міністэрства замежных спраў абараняў палітыку няпрызнаньня, якая праводзіцца ўрадам НАЗШ. Прадстаўнік вайскова міністэрства заявіў, што Чырвоная армія прадстаўляе сабою салідную васнную арганізацыю. На яго думцы, лімітрофы (пагранічныя з СССР дзяржавы), нават аб'яднаўшы свае ваенныя сілы, ня могуць разьлічваць на пасьпяховы ваенны напад на СССР. Прамоўца тутжа дадаў, што, па яго думцы, **чакаць агрэсыўных дзеяньняў з боку Чырвонай арміі ня прыходзіцца.**

У спрэчках выступілі прадстаўнік генэральнай электрычнай кампаніі Дэвэі і інжынэр Юз Фрэйн, зьвязаны дзелавымі адносінамі з СССР. Абодва прамоўцы вельмі жычліва адзываліся аб разгортваньні савецка-амэрыканскіх гандлёвых адносін. (ТАСС).

Нарада па пытаньнях партасьветы пры культпропе ЦК УсеКП(б)

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ ТАВ. СОЛЬЦА

МАСКВА. Нарада па пытаньнях усесаюзнай партасьветы заслухала даклад тав. **Сольца** на тэму: «Партасьвета ва ўмовах рэканструкцыі народнай гаспадаркі». За апошні пярыяд, сказаў дакладчык, і асабліва за апошні год узмацнілася цяга да ведаў з боку партыйна-актывістага і з боку ўсёй масы нашай партыі. У сярэдзіні у сетку партасьветы ўцягнута 30—40 проц. партыйнай масы. У горадзе фабрычна-заводская сетка партыйнай асьветы ў бягучым годзе ўзрасла і па колькасьці навучальных адзінак і па ліку слухачоў. Але гэты рост быў, галоўным чынам, за лік павялічэньня колькасьці беспартыйных слухачоў. У бягучым годзе яны складаюць 35,7 проц. усёй масы слухачоў.

У вёсцы сетка партыйнай асьветы скарацілася, але ў той-жа час канцэнтрант слухачоў за апошні год значна вырас. Удзельная вага беспартыйных тут яшчэ большая, чым у горадзе: у 1928-29 годзе — 30,4 проц., а ў сучасным годзе — 44,3 проц. Ва ўсю сыстэму партасьветы гораду і вёскі ў бягучым годзе было ўцягнута 33 проц. членаў партыі.

Колькасьць навучальных адзінак вырасла з 48 да 52 тысяч, а лік слухачоў з 862 тысяч да 1.777 тысяч чалавек. Нагогул, на ўсёй сетцы мы маем 43,6 проц. членаў партыі, 39,6 проц. беспартыйных і 16,8 проц. камсамольцаў.

Што-ж датычыцца тэарытычнай вучобы партыйнага актыву, дык яна вядзецца зараз вельмі нездавальняюча. У гэтых адносінах патрэбны пералом. Мы ня можам пакінуць партактыў без сыстэматычнай самаадукацыйнай або партыйна-асьветнай работы.

Вельмі шкоднымі ўспрымаюцца абстаіць справа з кадрамі прапагандыстых, асабліва фабрычна - заводзкай сеткі. Ва ўвесь рост паўстае пытаньне аб прыцягненьні да прапагандысцкай работы кіруючых партыйных кадраў — прафсаюзьнікаў, гаспадарнікаў і савецкіх работнікаў. Усімі партарганізацыямі ставіцца зараз пытаньне аб бесьперапынным навучальным годзе. Трэба выпрацаваць аднолькавую праграму для адзінай партшколы, камплектуючы школы не адзін раз, а тры-чатыры разы ў год. Неабходна прыстасаваць зьмест партыйнай асьветы да асноўных задач палітыкі партыі. **Сыстэма партасьветы будзе жыцьцёвай і поўнакроўнай толькі ў тым выпадку, калі яна будзе адпавядаць партыйнай палітыцы ва ўмовах рэканструкцыйнага пэрыяду.**

Бурны рост паўстанцкага руху ў Кітаі

УРАДАВАЕ ВОЙСКА ПЕРАХОДЗІЦЬ ДА КАМУНІСТЫХ

ШАНХАЙ, 12. Газэты штодзенна публікуюць аб росьце паўстанцкага руху. Камуністычныя атрады ў правінцыі Хунань, якімі кіруе камуністы Пан-дэ-Вай, прабуюць заняць паўднёвую частку гэтай правінцыі. У суседняй правінцыі Цзянсі атрад камуністых, які налічвае 1.000 чал., заняў станцыю Тэхан, у 60 мілях на поўначы ад галоўнага гораду правінцыі Нанчан па Нанчан-Фуцьзянскай чыгунцы, пагражаючы адсюль усяму раёну. Як падае ангельскі орган «Норд Чайна Дэйлі Ньюс», камуністычныя часьці занялі і ўстанавілі савецкую ўладу ў некалькіх раёнах правінцыі Гуансі, канфіскавалі і разьмеркавалі паміж сялянамі землю памешчыкаў. Часьць дывізіі генэрала Ган Ханціна, пасланая на поўнач Гуандуня для барацьбы з камуністымі, перайшла на старану апошніх. Па думцы «Шанхай бао» «камуністычная пагроза вельмі рэальна» у раёне гарадоў Югао і Шандунь (правінцыі Цзянсу).

ГОРАД ЗА ГОРАДАМ ПЕРАХОДЗІЦЬ У РУКІ КАМУНІСТЫХ

ШАНХАЙ, 13. «Сун Вень-Бао» паведамляе, што ў Хэнані «камуністыя праяўляюць актыўнасьць, не сустракаючы супраціўленьня, бо ўрадавыя вайскі перакінуты ў правінцыю Гуапсі. **Горад за горадам пераходзіць у рукі камуністых,** якія ўсюды ўстанаўліваюць свой рэжым». Кітайскі друк у Хэнані **рысуе грандыёзны малюнак руху, які ахапіў ня менш 25 паветаў.** У апошнія дні камуністыя заўладалі многімі гарадамі. У сталіцы Хэнаньскай правінцыі **Чанша** ўведзена ваеннае становішча і праводзяцца масавыя вулічныя вобыскі. У горадзе Дэлянг камуністыя напалі на гарнізон. Пры сутычках забіта шмат салдат. Улада гораду ахоплена панікай. **У раёне Сватоу паўстала 6 тысяч салдат,** пасланых на барацьбу з Чырвонай арміяй Чу-дэ, **часьць урадавых войск перайшла на старану Чу-дэ.**

Рух на Поўначы правінцыі Гуансі ўзмацняецца. Шмат гарадоў і пасёлкаў моцна пастрадалі ад сялянскіх паўстаньняў. Некаторыя гарады зусім зруйнаваны. У павеце Чэкінг галодныя сяляне ўварваліся ў Сэні, зруйнавалі рысавыя склады, разьмяркоўваючы рыс па вёсках. Паліцыя забіла і параніла дзесяткі сялян.

ЧАН КАЙ-ШЫ ЗАКУПЛЯЕ АТРУТНЫЯ ГАЗЫ

ПЭЙПІН, 12. Чан Кай-шы на працягу апошніх двух тыдняў праводзіў у Шанхаі вярбоўка салдат. Ня гледзячы на абяцаньне плаціць 20-30 долараў у месяц, вярбоўка прайшла з пязначным посьпехам. «Цзянь Нань Івінг Пост» паведамляе, што Чан Кай-шы вядзе перагаворы з Індя - Кітайскімі ўладамі аб закупцы знарадаў з атрутнымі газамі і інш. ваеннага забесьпячэньня.

У Шаопіне (правінцыя Сычуан) адбылася канфэрэнцыя сычуанскіх генэралаў. Канфэрэнцыя пастанавіла далучыцца да Ён Сі-шана і Фынь Юй-сяна супроць Чан Кай-шы. Рад генэралаў панкінскіх войск у Хубэі таксама рыхтуюцца да пераходу на бок анты-панкінскіх сіл.

Ангельскія ваенныя сілы ў Індыі

РЫГА, 8. Паводле слоў газэты «Рыгашэ Рундшаў», колькасны лік індыйскай арміі складае 270.000 чалавек, пазічаны паліцэйскіх сіл, якія ўдвая перавышаюць на колькасьці склад арміі. Камандныя пасады знаходзяцца ў руках англічан. У армію, прызначаную для падтрыманьня парадку ўнутры краю, уваходзіць 27 індыйскіх і 28 брытанскіх пяхотных батальёнаў, 1 ангельскі кавалерыйскі полк і 36 індыйскіх эскадронаў. У выпадку мабілізацыі да яе дадасцца 30.000 дапаможных войск, якія складаюцца з англічан і індыйцаў. Пагранічная армія складаецца пераважна з індыйскіх войск, у яе ўваходзяць часьці ўсіх радоў зброі, а таксама танкавы корпус, броня - часьці, сапёрныя батальёны і г. д. (ТАСС)

АБВАСТРЭНЬНЕ ФРАНЦУСКА-ІТАЛЬЯНСКІХ АДНОСІН

НЕПАКОЙ ЛЕЙБАРЫСЦКАГА ЎРАДУ

ЖЭНЭВА, 12. На прыёме прадстаўнікоў друку Гэндэрсон пацьвердзіў, што ён запрапанаваў Грандзі (італьянскаму міністру замежных спраў) і Брыяну сваё пасрэдніцтва ў французска - італьянскіх перагаворах аб морскіх узбраеньнях. З заявы Гэндэрсона з усёй відавочнасьцю відаць, што лейбарыстскі ўрад баіцца за лёс лёнданскага траістага разуменьня, у сувязі з абвастрэньнем французска - італьянскіх адносін. Прадстаўнік італьянскай дэлегацыі афіцыйна заяўляе, што Італія ў якасьці «максымальнай праграмы» згодна з Вашынгтонскім паразуменьнем аб нарытэце з Францыяй на катэгорыі суднаў з вадазьмяшчэньнем у 1000 тон і больш, аднак, не адступіць ад патрабаваньня нарытэту з французскім флётам у падводных лодках і крэйсарох, водазьмяшчэньнем у 10.000 тон, і іншых катэгорыях. Аднак, як вядома, ні Італія, ні Францыя, не надаюць крэйсарам звыш 10.000 тон значэньня для сваёй палітыкі ў Міжземным моры. Таму «ўступчывасьць» Італіі, зразумела, пазбаўлена ўсякага практычнага значэньня і зьяўляецца толькі манэўрам, разьлічаным на заваяваньне прыхільнасьці да сябе ангельскага пасрэдніка. Прадстаўнік французкай дэлегацыі заяўляе, што Францыя ні ў якім выпадку ня можа згадзіцца на «чудоўнацкі» нарытэт з Італіяй, пры нежаданьні Англіі і іншых зацікаўленых дзяржаў гарантаваць «бясьпеку» і роўнавагу морскіх сіл у Міжземным моры сакрэтным дагаворам. (ТАСС).

Антысавецкія дакументы Уолена— сфабрыкаваны рускімі белагвардзейцамі

ВЫКРЫЦЬЦІ АМЭРЫКАНСКАГА ДЭПУТАТА

ВАШЫНГТОН, 13. Дэпутат рэспубліканскай партыі Лагардзія заявіў, што дакументы, прадстаўленыя начальнікам Нью-Ёркскай паліцыі Уолепам—фальшыўкі. Лагардзія прад'явіў палаце ліст Вагнэра да ўласьнікаў Нью-Ёркскай друкарні. Вагнэр паведамляе ў лісьце, што ён друкаваў паводле заказу невядомага рускага бляшкі, у тэксьце якіх заключаецца слова «Камінтэрн». Вагнэр падкрэсьлівае, што зробленыя ў яго друкарні бляшкі падобны да тых, на якіх надрукаваны «дакументы» Уолена. Лагардзія паказаў, што рэдакцыя вячэрняй газэты «Нью-Ёрк Івінг Графік» пасьля параўнаньня бляшкаў Вагнэра «з дакумантамі» Уолена, устанавіла, што дакументы Уолена бясспрэчна зьяўляюцца фальшыўкамі. Лагардзія нават сказаў, што Уолен не дазволіў рэдактару «Нью-Ёрк Івінг Графік» параўнаць бляшкі Вагнэра з арыгіналамі дакумантаў. Лагардзія дамагаўся, каб эміграцкі камітэт палаты параўнаў бляшкі Вагнэра з «дакумантамі» Уолена, якіх ніхто яшчэ ня бачыў. (ТАСС).

На партканфэрэнцыях

Фрунзаўская

12 мая працягваліся спрэчкі па дакладу т. **Шпэктарава.** Выступілі т. т. **Васілевіч, Чарвякоў, Бейлін, Левін, Курцік і інш.**

На учорайшым пасяджэньні персанальным галасаваньнем абраны райком КП(б)Б у наступным складзе: **Шпэктараў, Будзінскі, Кавалеў, Боршч, Белаўоўская, Кінэр, Влоўштэйн, Барысэвіч, Зэнькоў, Грушнеўскі, Прахоранка, Тарасэвіч, Кальван, Суханава, Казлоўскі, Рыкалаў, Райхэльсон, Загароўскі, Паўленка, Крузмат, Курцік, Новікаў, Шушкевіч, Ярмолаў, Каждан, Розман, Радзюк, Шулькін, Бухман, Левін, Пэвзнэр, Грышанаў, Калабкоў, Канэр, Шчэпакоўскі, Скараход, Шусер, Мароз, Бафураў, Гальперын, Чэоўскі, Позьняк, Фіш, Раксін, Баран, Негневіцкі, Дварэцкі, Грыб, Лур'е, Ратковіч, Сапожнікаў, Пятрушын, Гітлін, Васкабойнікаў, Кірыльчык, Цёмкін, Хонік.**

Выбары кандыдатаў у члены РК і дэлегатаў на акруговую партканфэрэнцыю абгадуцца на сёньняшнім апошнім пасяджэньні канфэрэнцыі.

Шклоўская

ШКОЎ. (Ад наш. кар.). 13-га мая адчынілася раённая партыйная канфэрэнцыя Шклоўшчыны. На павестцы дня наступныя пытаньні: 1. Даклад ЦК КП(б)Б, 2) Справаздача Шклоўскага РК КП(б)Б. 3) Выбары на акруговую канфэрэнцыю.

Канфэрэнцыя заслухала прывітаньні ад калгасьнікаў Шклоўскага раёну.

Канфэрэнцыяй паслана прывітальная тэлеграма ЦК КП(б)Б, Магілёўскаму акруговому і ЦО «Зьвязьдзе».

З вялікім дакладам ЦК КП(б)Б выступіў тав. **Рачыцкі.**

2-я Барысаўская

Сёньня ўвечары адчынілася 2-я Барысаўская партканфэрэнцыя. На канфэрэнцыі прысутнічае звыш 200 дэлегатаў. З дакладам ЦКК КП(б)Б выступіў т. ГРЫСЭВІЧ.

Канфэрэнцыяй паслана прывітаньні ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б, Мен. АК КП(б)Б, «Правде» і «Зьвязьдзе».

Бальшавіцкай „Правде" прывітаньне ад Фрунзаўскай райпартканфэрэнцыі

«Правде» — Цэнтральнаму Органу Ленінскай партыі ў дзень 17-пігадовага юбілею са дня выхаду першага яе нумару — гарачае бальшавіцкае прывітаньне ад 3-й партканфэрэнцыі Фрунзаўскага раёну Менскай арганізацыі КП(б)Б.

«Правда» пад кіраўніцтвам Ленінскага ЦК увесь час сваёй баявой бальшавіцкай дзейнасьці вяла непрымірымую барацьбу са ўсялякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі. Бальшавіцкая «Правда», арганізуючы масы на справу сацыялістычнага будаўніцтва, безьлітасна змагалася і змагаецца супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левых» загібаў, супроць скажэньняў лініі партыі ў калгасным будаўніцтве.

Няхай жыве бальшавіцкая Ленінская «Правда»!

Няхай жыве УсеКП(б)!

VIII Менская акруговая партканфэрэнцыя

склікаецца

на 18 мая, а 7-й гадз. увечары ў Доме Камасьветы: (б. клюб імя Карла Маркса)

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Даклад ЦК КП(б)Б — т. ГЕЙ.
2. Даклад ЦКК КП(б)Б—тав. КАЛНІН.
3. Справаздача АК КП(б)Б — тав. СЛАВІНСКІ.
4. Справаздача рэв. камісіі — т. МУЛЯЎКА.
5. Справаздача АКК — т. ДАМБРОЎСКІ.
6. Вынікі сац. будаўніцтва ў акрузе на падставе выкананьня пяцігодк

За якасныя паказчыкі!

Мінулыя паўтара гады бяспрэчна пацвярджаюць, што, ня гледзячы на рад труднасьцяй, вызначаныя пяцігодкай тэмпы разьвіцьця нашай народнай гаспадаркі ня толькі можна выканаць, але і перавыканаць.

Асабліва вялікія дасягненьні мы маем па лініі рэспубліканскай прамысловасьці. Калі першы год пяцігодкі (1928-29 гасп. год) даў валавой прадукцыі на 173 млн. руб. ці рост у адносінах да папярэдняга году па 47,5 проц., дык ужо ў другім годзе мы на многа апярэдзілі вызначаныя ў пяцігадовым пляне тэмпы. За другі год валавая прадукцыя павінна даць рост у 77,5 проц. замест вызначанага паводле пяцігодкі, росту ў 26,1 проц., а ў абсалютных лічбах, па нязьменных цэнах 1926-27 г., замест 222,1 млн. руб. — 307,4 млн. руб. Выкананьне-ж плану за першыя 6 месяцаў бягучага году дало рост валавой прадукцыі ў 72,1 проц.

Колькасьць занятых у прамысловасьці рабочых дасягнула 31,2 тыс. чалавек. Другі год пяцігодкі дае значнае перавышэньне тэмпаў супроць вызначаных. Лік рабочых, занятых у нашай прамысловасьці, паводле прамфінпляну, будзе складаць 40,8 тыс. чал. замест 36,1 тыс. чал. Такое павялічэньне колькасьці рабочых у значнай частцы тлумачыцца пераходам раду прадпрыемстваў на бесьперапынку, што павялічыла колькасьць рабочых на нашых прадпрыемствах больш, як на 3.500 чалавек.

Прадукцыйнасьць працы ў 1928-29 годзе павялічылася на 25,6 проц. Сёлетні год дае яшчэ лепшыя вынікі. Замест вызначанага пяцігодкай павялічэньня прадукцыйнасьці працы ў 13,6 проц., прамфінпляну мяркуецца 35,1 проц., пры чым, першыя 6 месяцаў даюць рост прадукцыйнасьці працы ў 34,6 проц.

Але на дасягнутых посьпехах заспакойвацца ні ў якім разе нельга. Трэба цьвёрда памятаць, што мы, гаворачы аб процантным росьце і пашырэньні нашага будаўніцтва, параўноўваем нашы дасягненьні з тым, што мы мелі ў першым паўгодзьдзі 1929 году, калі наогул прамысловасьць давала параўнаўча слабыя паказальнікі, калі ў нас, у нашай прамысловасьці, ня фігуравалі такія вялізарныя фактары, як сацыялістычнае спаборніцтва, ударніцтва і бесьперапынка.

Усё гэта зьявілася толькі ў другім паўгодзьдзі, усё гэта дало рэальныя вынікі толькі ў другім паўгодзьдзі. Калі параўнаць колькасны рост прадукцыі прамысловасьці за першае паўгодзьдзе сёлетняга гаспадарчага году з сярэдня-гадавым ростам за ўвесь 1928-29 г., дык мы атрымаем 19 проц. і ў параўнаньні з другім паўгодзьдзем 1928-29 г. — 9 проц. У нас ёсьць многа рэзэрваў, якія могуць быць выкарыстаны і для ўзмацненьня сацспаборніцтва, ударніцтва, бесьперапынкі, рацыянальнае арганізацыі самой вытворчасьці і г. д. Нашай партыйнай і прафсаюзнай грамадзкасьці трэба ня толькі не паслабляць, але ўзмацніць увагу да выкананьня прамфінпляну.

Калі ў адносінах колькасных паказальнікаў прамфінпляну і пяцігодкі мы выканаем вызначаныя тэмпы, дык у адносінах якасных паказальнікаў мы, бязумоўна, адстаем. У 1928-29 г. было вызначана зьніжэньне сабекошту на 10 проц., фактычна мы маем зьніжэньне толькі на 4,6 проц. На 1929-30 г., паводле прамфінпляну, было вызначана зьніжэньне сабекошту прадукцыі ў 11 проц., а за мінулыя 6 месяцаў мы маем зьніжэньне толькі на 7 проц. Гэта сьведчыць вам аб сур'ёзным прарыве, аб тым, што выкананьне вызначаных работ, якія ў большасьці сваёй ідуць за кошт унутраных накапленьняў прамысловасьці, ставіцца пад пагрозай. Зьніжэньне сабекошту прадукцыі пакуль што ідзе ў асноўным за кошт **росту нагрузкі прадпрыемстваў**, і, як вынік гэтага, мы маем адпаведнае зьніжэньне накладных і цэхавых выдаткаў. Вельмі слаба праводзіцца зьніжэньне сабекошту за лік выдаткаў на сыроды, паліва і прадукцыйнасьці працы.

Як адмоўнае зьявішча ў рабоце нашай прамысловасьці, трэба адзначыць, у першую чаргу, усё горшую якасьць прадукцыі, якую мы выпускаем. Трэба, на вялікі жаль, канстатаваць, што на гэту работу прамысловасьці мы да апошняга часу зварачалі вельмі мала ўвагі. Як гэта ня дзіўна, але дагэтуль мы не паклапаціліся выпрацаваць мэтаду нашай работы па праверцы якасьці прадукцыі. Калі-б якасьць нашых тавараў была-б вышэй (а дабіцца гэтага можна і трэба), дык напружанасьць на спажывецкім рынку была-б моцна паслаблена. Нам здаецца, што **якасьць** гэта тое зьвяно, за якое мы павінны вельмі моцна ўчапіцца, ухапіцца з уласьцівай нам бальшавіцкай стойкасьцю, змагацца за яе паляпшэньне, мабілізуючы вакол гэтага пытаньня ўсю шырокую рабочую грамадзкасьць. Тут мы сустрэнем самы шырокі водгук сярод рабочай масы, бо дрэнная якасьць тавараў б'е, у першую чаргу, па рабочым спажыўцы, уплываючы на ўзровень яго рэальнай зарплаты.

Нам здасьцца, што нашы органы, якія кіруюць харчовым забесьпячэньнем рабочых, ня гледзячы на цэлы рад цяжкіх аб'ектыўных умоў, маглі-б зрабіць куды больш, чым зроблена да апошняга часу. Трэба больш зьвярнуць увагі на магчымасьці па забесьпячэньні таварам, які ёсьць на месцы, трэба зьвярнуць больш увагі на прадукты харчаваньня другараднага значэньня, якія змаглі-б замяніць сваёй калёрыйнасьцю дэфіцытныя прадукты. Аб гэтым было сказана і напісана вельмі многа, але дасягненьняў у гэтай галіне пакуль мала.

Капітальнае будаўніцтва сёлета набывае вялізарны размах: калі ў 1928-29 годзе капітальнае будаўніцтва па прамысловасьці складала 25 млн. рублёў, дык у 1929-30 г. яно складае, паводле прамфінпляну, 52,2 млн. руб., г. зн. рост больш, чым на 100 проц. І ў гэтым годзе, як і ў папярэднія гады, мы маем хібы ў адносінах своячасовага складаньня праектаў, забесьпячэньня нашага будаўніцтва патрэбнымі матар'ялямі і кваліфікаванай рабочай сілай. У далейшым трэба рашуча ўзяцца за зьніжэньне ўсіх гэтых недахопаў. Трэба ўжо зараз прыступіць да складаньня праектаў на асноўныя аб'екты будаўніцтва, вызначаныя, паводле кантрольных лічбаў на 1930-31 год. Трэба мець ужо да пачатку будаўнічага сэзону зусім надрыхтаваныя пункты для будаўніцтва. Калі ў адносінах матар'ялаў, якія мы атрымліваем на-за межамі БССР, мы прымушаны лічыцца з тым, што ў даны момант Саюз можа нам вызначыць, выходзячы з агульных сваіх рэсурсаў і патрэбнасьцяй наасобных галін і частак, дык у адносінах матар'ялаў, якія могуць быць атрыманы ў БССР, мы павінны быць максымальна забясьпечаны.

Трэба максымальна пашырыць выпрацоўку будаўнічых матар'ялаў. Трэба, урэшце, скончыць з такімі ненармальнымі зьявішчамі, калі мы будуем цагельні для забесьпячэньня цэглаю будаўніцтва таго-ж году, у які мы пачынаем будаваць цагельні.

Мэталь, які зьяўляецца ў апошні час асабліва дэфіцытным матар'ялам, трэба замяняць у максымальнай меры матар'ялямі мясцовага вырабу з мясцовага сырцу. Нашы тэхнічныя сілы вельмі кансэрватыўны ў гэтай галіне. Трэба рашучы сур'ёзны штуршок у гэтым напрамку. Трэба сур'ёзна падумаць над гэтым пытаньнем і прыступіць да канкрэтнай работы. Тут можна ісьці і па шляху **часовай** замены мэталю матар'ялам мясцовага значэньня, з тым, каб замяніць яго мэталем праз некаторы час, калі ў Саюзе будуць пушчаны ў ход новыя магутныя мэталюргічныя заводы.

У забесьпячэньні рабочай сілай нашага будаўніцтва мы таксама маем сёлета цэлы рад труднасьцяй. Гэта, галоўным чынам, тлумачыцца тым, што нашы органы, у першую чаргу органы працы, ня ўлічылі тых вялізарных зрухаў, якія адбыліся ў вёсцы.

Магутная хваля калектывізацыі захапіла нашы органы працы зьнянацку і яны вельмі туга прыстасоўваліся да новай абстаноўкі і да новых акалічнасьцяй. Стары мэтад вярбоўкі сэзоннай рабочай сілы ў новых умовах павінен быць заменены плянавым прыцягненьнем і падрыхтоўкай рабочай сілы, пры чым тэрытарыяльна курсы на падрыхтоўцы кваліфікаванай рабочай сілы павінны быць перанесены, галоўным чынам, у вёску, у першую чаргу, у калгасы, дзе для іх навучаньня павінен быць выкарыстаны зімовы час. Гэта дасьць магчымасьць займацца падрыхтоўкай рабочай сілы бяз тэй сьпешкі і метусяніны, якія маюць месца ў нас пры гэтай рабоце зараз. Пры такой пастаноўцы работы мы зможам сапраўды арганізаваць плянавую падрыхтоўку рабочай сілы ў пэўных раёнах пэўнай кваліфікацыі, ня будучы ўжо тады зьвязанымі з аджыўшым, гістарычна ўстаноўленым разьмеркаваньнем кваліфікаванай рабочай сілы на паасобных раёнах.

Ня менш востра стаяла і стаіць да апошняга часу пытаньне з забесьпячэньнем будаўнічых рабочых як жыльлём, так і харчаваньнем. Усе гэтыя труднасьці можна перамагчы, для гэтага толькі трэба зрабіць усе намаганьні і памятаць аб гістарычнай задачы, што стаіць перад намі: «дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краі».

С. ГОЛЬДБЭРГ.

На партканфэрэнцыі БВА

У ранішнім пасяджэньні 13-га мая працягваліся спрэчкі па дакладу тав. Уншліхта. З 60-ці запісаўшыхся выказалася 35 таварышоў.

У сваім заключным слове тав. Уншліхт зьвярнуў увагу канфэрэнцыі на неабходнасьць павысіць якасьць работы, дабіцца большай эканоміі ў выдаткаваньні дзяржаўных сродкаў. Тав. Уншліхт асабліва спыніўся на пытаньні адзінства начальніцкага складу і канстатаваў, што ў галіне адзінаначальнікаў мы маем рост адзінаначальнікаў і значнае паляпшэньне ў іх рабоце.

— «Лёзунгам гэтай канфэрэнцыі»— гаворыць тав. Уншліхт—«павінен быць 100-процантны ўдзел партыйцаў і камсамольцаў ва ўдарным руху і сацыялістычным спаборніцтве і гэта павінна стаць пастаянным мэтадам умацаваньня баявой падрыхтоўкі».

Для выпрацоўкі рэзалюцыі па дакладзе тав. Уншліхта выбрана камісія ў ліку 15-ці асоб.

З вялікім дакладам аб рабоце палітычнага кіраўніцтва Беларускай Вайсковай Акругай выступіў т. **Аранштам.**

—Партыйная арганізацыя акругі—сказаў у сваім дакладзе тав. Аранштам — вяла барацьбу за генэральную лінію партыі, пад лёзунгам непрымірымасьці да ўсіх хістаньняў і ваганьняў ад лініі партыі, якая праводзіцца ленінскім ЦК. У далейшай сваёй рабоце, умацоўваючы балявую гатоўнасьць часьцей акругі, партарганізацыі аддаюць патрэбную ўвагу далейшай барацьбе з правай небясьпекаю, як на практыцы, так і ў тэорыі, асабліва з праяўленьнямі правай практыкі ў асобных умовах жыцьця армейскіх арганізацый.

У сярэдзіне свайго дакладу т. Аранштам аддаў шмат увагі пытаньню камсамольскай работы ў часьцях акругі.

Усё вячэрняе пасяджэньне канфэрэнцыі было прысьвечана заслуханьню дакладу тав. **Ягорава** аб баявой падрыхтоўцы акругі.

— Аснoўныя дзьве задачы — казаў тав. Ягораў — гэта аўладаньне складанымі формамі бою, аўладаньне вышэйшай ступеняю стралковай справы з тым, каб умець злучыць стралковую і тактычную падрыхтоўку і тым самым падняць на вышэйшую ступень баявую падрыхтоўку часьцей.

Асаблівую ўвагу тав. Ягораў зьвярнуў на пытаньне разьвіцьця і ўдасканаленьня ведаў тэхнікі начальніцкім складам, каб ён мог апошнюю шырэй скарыстоўваць ва ўмовах вядзеньня сучаснага бою.

Канфэрэнцыю вітаў прадстаўнік Украінскай вайсковай акругі тав. **Кавалёў**, дэлегацыя 5-й Віцебскай ударнай дывізіі і прадстаўнікі пагранічных часьцей і войск ДПУ.

— Ад імя вартавога параду межаў Савецкага Саюзу IX партыйнай канфэрэнцыі БВА гарачае чакісцкае прывітаньне. Мы прышлі запэўніць канфэрэнцыю ў тым, што завет нябожчыка Дзяржынскага — «Граніцу на замок»— мы выконваем.

Сёньня ўвесь дзень па дакладах т.т. Аранштама і Ягорава будуць весьціся агульныя спрэчкі.

Гучныя рэзалюцыі і правыя справы

«Год вялікага пералому» выклікаў таксама вялізарную хвалю энтузіязму рабочых мас. Гэта выяўляецца ў вялізарным разгортваньні сацспаборніцтва, ударніцтва, у пераходзе ўдарнага руху на вышэйшую ступень — ударных цэхаў і заводаў, у стварэньні камуністычных цэхаў і камуністычных заводаў і г. д.

Гэты ўздым зьяўляецца гарантыяй пасьпяховага выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады, гарантыяй у тым, што мы пераможам усе труднасьці, якія стаяць на шляху нашага будаўніцтва.

Задача партыйнай арганізацыі — перабудаваць сваю работу, каб накіраваць гэты ўздым у рэчышча пасьпяховага сацыялістычнага будаўніцтва, каб перавесьці яго на вышэйшую ступень.

Гэтых вялікіх працэсаў не заўважаюць толькі правыя апартуністыя. Толькі правыя апартуністыя ігнаруюць, не выкарыстоўваюць тэй магутнай хвалі энтузіязму, якая ўзьнімаецца ў нэтрах рабочых мас для паскарэньня тэмпаў нашага будаўніцтва.

Тое, што здарылася ў Віцебску на фабрыцы «Прафінтэрн» служыць прыкладам таго, як часамі над заслонай гучных рэзалюцый аб правільнасьці лініі партыі, аб падгрыманьні ЦК, хаваюцца самыя яўныя правыя справы.

Кіраўнікі парткалектыву «Прафінтэрн» ня раз выступалі на сходах і гаварылі аб шкоднасьці правага ўхілу і аб барацьбе з правым ухілам. А што-ж адбывалася ў буднях кіраўніцтва фабрыкі «Прафінтэрн»?

Будні «Прафінтэрна» зьяўляюцца прыкладам таго, як парткіраўніцтва на фабрыцы ажыцьцяўляла правы ўхіл на практыцы.

Яскравым выразам гэтых правых спраў зьяўляецца справа Бараноўскай. Што гэта за справа? Работніца Бараноўская, кандыдат партыі, падала на віцебскай акруговай канфэрэнцыі ўдарнікаў заяву аб тым, што яна зьніжае расцэнкі па 0,1 проц. з кожнай апэрацыі. Гэта складае больш чым 15 руб. у месяц. Яна выклікала некалькіх работніц-партыяк пасьледваць свайму прыкладу.

Трэба было чакаць, што партыйны калектыў падтрымае гэтую ініцыятыву работніцы Бараноўскай. Але-ж не. Партарганізацыя фабрыкі «Прафінтэрн» плылася ў хвасьце настроюў адсталых рабочых. Паўкова Бараноўская чалася агіднае цкаваньне. Парткалектыў ня толькі ня даў адпору гэтаму цкаваньню, але нават бюро цэх'ячэйкі дало **Бараноўскай** партыйнае ўнушэньне нібы за склочніцтва. У цкаваньні прымалі актыўны ўдзел партыйцы-актывістыя. Гэтыя гора-актывістыя накшталт Чорнамордзік, Капылавай і інш. распаўсюджвалі чуткі аб тым, што Бараноўская «шкурніца», «падхалімка», «выскачка» і г. д.

Неабходна таксама адзначыць, што Віцебскі райком № 2 даўны дырэктыву аб тэрміновым расьсьледваньні гэтай справы ў сувязі з заявай мужа Бараноўскай, не паклапаціўся прасачыць за тым, што зроблена па гэтай дырэктыве. Дзякуючы гэтаму, рэзалюцыя райкому была пакладзена пад сукно. Уся справа Бараноўскай выявілася толькі дзякуючы расьсьледваньню інструктара ЦК КП(б)Б т. Равінскага.

Справа Бараноўскай зьяўляецца толькі адным з кветак у буксіе правых спраў парткіраўніцтва фабрыкі «Прафінтэрн». Сярод партыйцаў на фабрыцы махравым цьветам раськвітнеў хвасьцізм. Шмат партыйцаў на фабрыцы ішлі ў «авангардзе» супраціўленьня зьніжэньня расцэнак. Партыйцы выступалі начальнікамі павышэньня расцэнак (Асфровіч).

Толькі 50 проц. камуністых на фабрыцы прымалі ўдзел ва ўдарных брыгадах.

Партарганізацыя фабрыкі не сыгналізавала аб усіх гэтых зьявішчах, не рвала з імі барацьбы.

Што гэта значыць? Гэта значыць, што партарганізацыя, якая не адзін раз прымала правільныя рэзалюцыі аб барацьбе з правым ухілам, не праводзіла рашучай барацьбы з праваапартуністычнай практыкай, якая мела месца на фабрыцы.

Усё гэта стала магчымым толькі таму, што бюро парткалектыву не ўявло крытыку і самакрытыку ў сыстэму сваёй работы, што на фабрыцы існаваў заціск самакрытыкі.

Пасьпяхова змагацца з правым ухілам, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе і з «левымі» загібамі, можна толькі на аснове шырокага разгортваньня самакрытыкі, толькі на аснове выкарыстаньня актыўнасьці шырокіх мас.

Разгортваючы шырокую, бальшавіцкую самакрытыку партарганізацыя фабрыкі выпраўіць свае памылкі, узмацніць барацьбу з правай практыкай.

С. Я.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Кастрычніцкая партканфэрэнцыя

Спрэчкі па дакладу тав. Гантмана

Першым па дакладу т. **ГАНТМАНА** аб рабоце ЦК КП(б)Б выступіў тав. **КРУГЛІКАЎ.**

Тав. Круглікаў гаварыў аб пытаньнях калгаснага будаўніцтва. ЦК КП(б)Б рашуча рэагаваў на скрыўленьні партыйнай лініі ў калгасным будаўніцтве, дапушчаныя радам партарганізацый. Потым прамоўца спыніўся на памылках і скрыўленьнях, меўшых месца ў дзейнасьці Калгасцэнтру БССР. Калгасцэнтр не заўсёды выразна праводзіў клясавую лінію. Калгасцэнтр, адчуваючы моцнае «головокружение», дапусьціў рад грубых памылак. Тав. Круглікаў завастрае ўвагу на задачы хутчэйшай ліквідацыі ўсіх памылак і скрыўленьняў у калгасным будаўніцтве, дапушчаных у радзе месц.

Далей т. Круглікаў гаворыць аб антырэлігійнай рабоце. Не сакрэт, — заявіў прамоўца, — што ў гэтай рабоце маюць месца сур'ёзныя недахопы. На радзе заводаў, фабрык і ўстаноў зусім няма антырэлігійных гурткоў. Мы павінны дабіцца карэннага пералому ў антырэлігійнай рабоце.

Тав. **КУШНЯРОЎ.** Ён гаворыць аб вылучэньні рабочых на кіраўнічую працу. У нас, часамі, вылучэньне праводзіцца ў габінэтным парадку. Кандыдатуры вылучэнцаў не абмяркоўваюцца на шырокіх рабочых сходах. На курсах вылучэнцаў пры ЦК КП(б)Б праграмы неўдаскапаленыя. Вылучэнцы ня маюць магчымасьці атрымаць практычных ведаў.

Некалькі слоў аб прамысловай капэрацыі. На гэтым вучастку былі дапушчаны буйныя памылкі. Мы мелі ў зьвеньнях прамысловай капэрацыі правую практыку. Праўда, зараз кіраўніцтва прамысловай капэрацыі зьмянена, аднак, гэта арганізацыя ня ўзмоцнена патрэбнымі кіраўнічымі кадрамі.

Тав. **ПАЛЯКОЎСКІ.** Вялікія посьпехі ў разгортваньні сацыялістычнага будаўніцтва на Беларусі, посьпехі калгаснага будаўніцтва, пасьпяховае выкананьне пяцігодкі сталі магчымымі ў выніку палітычна правільнага выразнага кіраўніцтва з боку Цэнтральнага Камітэту нашай партыі. Разам з гэтым ЦК дапусьціў асобныя памылкі ў пытаньнях калектывізацыі. Цэнтральны Камітэт КП(б)Б з усёй бальшавіцкай рашучасьцю прызнаў і асудзіў гэтыя памылкі. Наша далейшая задача заключаецца ў тым, каб безадкладна выправіць памылкі, дапушчаныя ў асобных мясцох пры арганізацыі калгасаў. Мы павінны рашуча ўзмацніць работу па самастойнай арганізацыі батрацтва і беднаты. Бяз гэтага нельга гаварыць аб замацаваньні посьпехаў калектывізацыі і далейшым разгортваньні калгаснага будаўніцтва на аснове дырэктыў партыі.

Далей т. Палякоўскі гаворыць аб барацьбе за прамфінплян. Рад заводаў і фабрык пагоршылі якасьць прадукцыі. Некаторыя гаспадарнікі ў пагоні за колькасьцю забываюць пра якасьць прадукцыі. Яна канцы свайго выступленьня тав. Палякоўскі падкрэсьліў, што партыйныя арганізацыі Беларусі, над кіраўніцтвам свайго ЦК, няўхільна змагаюцца за генэральную лінію партыі.

Тав. **ВАЙНЭРОВІЧ.** Мы павінны ўзмацніць культурнае абслугоўваньне рабочых мас. На нашы заводы і фабрыкі кожны дзень прыходзяць новыя кадры рабочых. Сярод іх трэба ўзмацніць палітвыхаваўчую работу. У прыватнасьці, мы павінны зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу па культурнае абслугоўваньне рабочых-сэзоннікаў. У канцы свайго выступленьня т. Вайнэровіч гаварыў аб памылках т. Чарвякова.

Тав. **УЛАСАЎ.** Падрыхтоўка новых пралетарскіх кадраў зьяўляецца цэнтральнай праблемай. Таму мы павінны зрабіць усё, каб з посьпехам вырашыць гэту праблему. Канкрэтна прамоўца гаварыў аб падрыхтоўцы кадраў для Чырвонай арміі. Трэба аддаць больш увагі ўкамплектаваньню вайсковых навучальных устаноў.

Тав. **ШУЛЬМАН** падкрэсьлівае, што мы павінны яшчэ больш разгарнуць дзейсную самакрытыку, скарыстаць зброю самакрытыкі для выкрыцьця і выпраўленьня памылак, меўшых месца ў калгасным будаўніцтве.

Тав. Шульман адзначыў, што газэта **«ЗЬВЯЗДА»** ў пытаньнях калгаснага будаўніцтва дапусьціла асобныя памылкі, якія ня былі своячасова выпраўлены. Потым т. Шульман гаварыў аб праблеме кадраў і аб пытаньнях барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам.

Тав. **ВІШНЕЎСКАЯ** адзначыла, што ЦК правёў вялікую работу па барацьбе з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай і з «левымі» загібамі, з рэшткамі контр-рэвалюцыйнага трацкізму. Потым прамоўца гаварыла аб задачах работы сярод жанчын.

Канфэрэнцыя даручыла новаму складу бюро тэрмінова абгаварыць пытаньне аб скажэньнях партыйнай лініі ў некаторых ячэйках раённай арганізацыі і прыцягнуць да суровай адказнасьці канкрэтных носьбітаў зла.

Акруговая партыйная канфэрэнцыя Магілёўскай арганізацыі адкрываецца 20-га мая. Канфэрэнцыя заслухае даклады ЦК і ЦКК КП(б)Б і справаздачы АК і АКК КП(б)Б. Побач з гэтым канфэрэнцыя абмяркуе даклады аб пяцігадовым пляне прамысловасьці і калгасным руху.

На хаду перавыбараў

Полацак

Адбыліся па-зачарговыя перавыбары **Ветрынскага** раённага камітэту партыі. Бюро Ветрынскага РК КП(б)Б было распушчана за рад грубых скажэньняў партыйнай лініі пры правядзеньні калектывізацыі. Выбары новага складу раённага камітэту прайшлі пры актыўным удзеле партыйнай арганізацыі і поўным захаваньні ўнутрапартыйнай дэмакратыі.

20-га мая адбудзецца VI акруговая партканфэрэнцыя. У парадку дня канфэрэнцыі стаяць даклады ЦК і ЦКК КП(б)Б, справаздача АК і справаздача АКК КП(б)Б. Апрача справаздачы рэвізійнай камісіі АК КП(б)Б, акруговая канфэрэнцыя абмяркуе ягчэ даклады аб далейшых задачах па сацыялістычнай перабудове вёскі і аб пяцігадовым пляне разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры Полацкай акругі.

Магілёў

Два дні працавала **Прапойская** раённая партканфэрэнцыя. Канфэрэнцыя на аснове самакрытыкі жорстка асудзіла і прызнала палітычныя памылкі, дапушчаныя раённай партарганізацыяй у калгасным будаўніцтве. Канфэрэнцыя падкрэсьліла грубую памылку райкому партыі, які, ня маючы адпаведнай базы, фарсаваў тэмпы калектывізацыі ў раёне, імкнучыся ва што-б там ні стала калектывізаваць у хутчэйшы тэрмін увесь раён на 100 проц. Дэлегаты канфэрэнцыі рубам паставілі пытаньне аб прызнаньні і хутчэйшай ліквідацыі меўшых месца ў Прапойскім раёне антысерадняцкіх перагібаў і скрыўленьняў дырэктыў партыі аб калгасным будаўніцтве.

Пры абмеркаваньні дакладу Магілёўскага АК КП(б)Б канфэрэнцыя завастрыла ўвагу на палітычных памылках і правалах старога складу акруговага парткіраўніцтва. Дэлегаты канфэрэнцыі рашуча асудзілі паводзіны члена бюро АК КП(б)Б т. **Лягерава**, які, прыехаўшы ў Прапойск, аддаў наступную дырэктыву: «у самы хутчэйшы тэрмін раён павінен быць калектывізаваны на ўсе 100 проц. Прапаную ліквідаваць местачковую буржуазію і праз 3 дні зьняць усе званы з цэркваў».

Трэба адзначыць, што на раённай канфэрэнцыі мелі месца асобныя выступленьні, аўтары якіх замазвалі дапушчаныя памылкі і перагібы, імкнуліся дыскрэдытаваць лінію партыі і г. д. Партыец Мацьвееў, напрыклад, выступіў з «тэорыяй» аб тым, што мы маем «разрыў саюзу паміж рабочай клясай і сярадняком». Партыйная канфэрэнцыя выкрыла антыпартыйную, капітулянцкую сутнасьць гэтага выступленьня і рашуча асудзіла яго.

ДА ЎВАГІ ЎСІХ ЧЛЕНАЎ ПАРТЫІ, ЧЛЕНАЎ ЛКСМБ, РАБОЧЫХ і СЛУЖАЧЫХ!

У сувязі з тым, што ў чэрвені месяцы адкрываецца

16-ы ПАРТЫЙНЫ ЗЬЕЗД,

для задавальненьня падпісчыкаў газэтай „ПРАВДА“ з 1 чэрвеня, Беларускае Аддзяленьне Выдавецтва ЦК УсеКП(б) „Правда“

прыступіла к прыёму падпіскі на „ПРАВДУ“

і ўсе астатнія выданьні названага выдавецтва

на ЧЭРВЕНЬ месяц.

Просьба да ўсіх партыйных, прафэсіянальных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый **своячасова падпісацца на „ПРАВДУ“**, бо позьняя здача падпіскі можа выклікаць незадавальненьне падпісчыкаў газэтай за першыя дні чэрвеня месяца.

ТЭЗІСЫ і ПРАДЗЬЕЗДАЎСКІ МАТАР'ЯЛ ПАЧАЛІ ПУБЛІКАВАЦЦА Ў «ПРАВДЕ» З 13 МАЯ САЧЭЦЭ за „ПРАВДОЙ“.

Беларускае Аддзяленьне Выд-ва ЦК УсеКП(б) „ПРАВДА“, Савецкая, 61.

РАЙКОМЫ, ПАРТ'ЯЧЭЙКІ і УПОЎНАВАЖАНЫЯ!

У другой палове мая адкрываецца

13 ЗЬЕЗД КП(б)Б.

Работа зьезду будзе асьвятляцца поўнасьцю на старонках „ЗЬВЯЗДЫ“.

Каб даць магчымасьць атрымліваць у маі месяцы газ. „ЗЬВЯЗДА“ тым падпісчыкам, якія не пасьпелі падпісацца з 1 мая,

АДКРЫТА ПАДПІСКА на „ЗЬВЯЗДУ“

з 16 МАЯ (поўмесячная) і далейшыя тэрміны.

Аб аднэй „спробе аўтабіяграфіі“

«Ня можа быць большага ідэёвага ўпадку для рэвалюцыйнага палітыка, як ашукваюць масы». (Л. Троцкі «Моя жизнь»).

Чалавека, які хацеў-бы вывучыць гісторыю нашай рэвалюцыі «паводле Троцкага», чакае жорсткае расчараваньне. Бо ніякай гісторыі, нават вельмі суб'ектыўна афарбаванай, у яго кніжцы «Моя жизнь» няма. Але «чалавечы дакумант» атрымаўся найвыразнейшы.

«... Гэта кніга не халодная фатаграфія майго жыцьця, а не суцэльная частка. На гэтых старонках я праводжу далей тую барацьбу, якой прысьвечана ўсё маё жыцьцё. Выкладаючы, я характарызую і ацэньваю, расказваючы, я абараняюся і яшчэ часьцей нападаю. Мне думаецца, што гэта адзны спосаб зрабіць біяграфію аб'ектыўнай у некаторым больш высокім сэнсе, г. зн. зрабіць яе найбольш адэкватным выяўленьнем асобы, умоў і эпохі». («Моя жизнь», т. 1, стар. 7).

Гэта, вядома, не найлепшы спосаб даць «адэкватнае выяўленьне» «умоў і эпохі» і ў тым сэнсе «Моя жизнь» Троцкага нічога не дае, як убачыць чытач на радзе прыкладаў. «Адэкватнае выяўленьне асобы» яна дае нават у большай ступені, чым самой «асобе» гэта патрэбна. Наўрад ці Троцкі, займаючыся «спробай» сваёй аўтабіяграфіі, думаў надагуліць сабе канчаткоў выпік, як гістарычнаму дзеячу. Наўрад ці гэтай кніжкай ён зьбіраўся залічыць сябе канчаткова «на гісторыі». А між тым пасьля «Моей жизни» гаварыць аб Троцкім, як кіраўніку чаго-б і каго-б там ні было, таксама мала магчыма, як аб Керанскім.

Параўнаньне гэтых дзьвюх фігур няўхільна навязваецца, калі чытаеш «Мою жизнь».

«Керанскага Ленін называў «хвальком». Да гэтага нямнога можна дадаць і зараз. Керанскі быў і застаўся выпадковай фігурай, «временщиком» гістарычнай мінуты. Кожная новая магутная хваля рэвалюцыі, якая ўцягвае накранутыя, яшчэ неразборлівыя масы, няўхільна падымала наверх такіх трэсцу на гадзіну, якія зараз-жа сьцепнуць ад уласнага бляску». («М. ж.», т. II, стар. 8).

Гэта — аўтахарактарыстыка пад выглядам характарыстыкі другога. Надбіраючы матар'ял для гэтага артыкулу, я адвёў спачатку для рубрыкі «хвальба» (не завесьці такой рубрыкі нельга было—падта ўжо біла ў вочы) адзін радок. Аказалася, мала. Я дадаў другі. І гэтага было мала. Я павінен быў дадаць трэці. Не хапіла і яго, і прышлося ўпісваць спасылкі на старонкі над радкамі, паміж радкамі, збоку, зьверху, зьнізу. Няма ніякай магчымасьці падаць тут хаця-б большую частку адзначанага—атрымалася-б цэлая хрэстаматыя ў пару дзесяткаў друкаваных аркушаў. Я абмяжоўваюся самымі яскравымі прыкладамі, якія даюць, да рэчы, паняцьце аб **тоне** ўсёй кніжкі.

Я прапускаю прыклады хвальбы, якія адносяцца да часоў дзяцінства,—хвальбы сваімі пяцёркамі, тым, што рапец быў заўсёды ў нарадку, вучнёўская кніжка заўсёды на месцы і г. д. Гэта—дробна, але трэба сказаць, што гэта дробна ня толькі для крытыка, а і для аўтара. Бо гэты-ж аўтар прэтэндаваў ні больш, ні менш, як на тое, каб быць наступнікам Леніна—заўляў прэтэнзію на пазыцыю сусьветнага значэньня, на ролю сусьветна-гістарычнага дзеяча. Як да гэтага ідзе любаваньне сваімі гімназычнымі посьпехамі!

Але вось перад намі Троцкі—ужо буйная палітычная фігура. Надышоў 1905 год. «13-га лістапада мы паставілі ў блёку з меншавікамі вялікі палітычны орган «Начало». Тыраж газэты рос ня днямі, а гадзінамі. Бальшавіцкая «Новая Жизнь» бяз Леніна была шаратай. «Начало», наадварот, карысталася гіганцкім посьпехам. Думаю, што яно бліжэй, чым якое-б там ні было другое выданьне за паўвека, падыходзіла да свайго клясычнага прадапыну, «Новай Рэйнскай Газэты» Маркса ў 1848 годзе» (!!) («М. ж.», т. 204).

Пасьля гэтага зусім зразумела, што «перапіска Маркса і Энгельса была для мяне (Троцкага.—**М. П.**) не тэарытычным, але псыхалёгічным адкрыцьцём... я пераконваўся на кожнай старонцы, што з гэтымі двума мяне зьвязвае непасрэднае псыхалёгічнае сваяцтва. Іх адносіны да людзей былі для мяне блізкімі. Я здагадваўся аб тым, чаго яны не давыказвалі, падзяляў іх сымпатыі, абураўся і ненавідзеў разам з імі. Маркс і Энгельс былі рэвалюцыянэры наскрозь... (240).

Прыходзіць другая рэвалюцыя, першае паражэньне—ліпнёўскія дні. «Ленін і Зіноўеў схаваліся». «Леніна ня было». «Ленін, абвешчаны нямецкім шпіёнам, хаваўся ў шалашы» (т. II 34,36, 233). Гэта паўтарацца і прыпамінацца пры кожным зручным і нязручным выпадку, ускрываючы сапраўдныя пачуцьці пішучага да таго, перад кім ён, выбачце за выраз, з самай подлай двуліцасьцю, нібы схіляецца на працягу ўсёй сваёй кніжкі.

«Бальшавіцкая фракцыя ЦВК адчувала сябе сіратліва ў будынку Таўрыдзкага палацу. Яна паслала па мяне дэлегацыю з просьбай зрабіць даклад аб створаным становішчы, ня гледзячы на тое, што я ўсё яшчэ ня быў членам партыі: фармальны акт аб'яднаньня быў адкладзен да надыходзячага партыйнага зьезду. Я, зразумела, ахвотна згадзіўся (!!). Мая гутарка з бальшавіцкай фракцыяй устанавіла такія маральныя сувязі, якія стваралі туга прыстасоўваліся да новай абстаноўкі і да новых акалічнасьцяй. Стары мэтад вярбоўкі сэзоннай рабочай сілы ў новых умовах павінен быць заменены плянавым прыцягненьнем і падрыхтоўкай рабочай сілы, пры чым тэрытарыяльна курсы на падрыхтоўцы кваліфікаванай рабочай сілы павінны быць перанесены, галоўным чынам, у вёску, у першую чаргу, у калгасы, дзе для іх навучаньня павінен быць выкарыстаны зімовы час. Гэта дасьць магчымасьць займацца падрыхтоўкай рабочай сілы бяз тэй сьпешкі і метусяніны, якія маюць месца ў нас пры гэтай рабоце зараз. Пры такой пастаноўцы работы мы зможам сапраўды арганізаваць плянавую падрыхтоўку рабочай сілы ў пэўных раёнах пэўнай кваліфікацыі, ня будучы ўжо тады зьвязанымі з аджыўшым, гістарычна ўстаноўленым разьмеркаваньнем кваліфікаванай рабочай сілы на

БАРАЦЬБА З ГРАБЕЖНІЦКІМІ СТРАТАМІ ЭНЭРГІІ І АПАЛУ

РАЦЫЯНАЛІЗАВАЦЬ ЭНЭРГЕТЫЧНУЮ ГАСПАДАРКУ Ў БССР

Учора была зьмешчана адозва за подпісамі старшыні Дзяржпляну тав. Кржыжаноўскага, намесьніка старшыні ВСНГ СССР тав. Рухімовіча і сакратара ЎсесЦСПС тав. Вайнбэрга да ўсіх гаспадарнікаў, прафсаюзаў, рабочых і інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу аб неабходнасьці распачаць рашучую барацьбу са стратамі анералу і сілавой энэргіі.

Наш супраціўнік зьвяртаецца ў Энэргабюро ВСНГ БССР для высьвятленьня пытаньня, як у нас у БССР пастаўлена гэта справа і якая барацьба вядзецца са стратамі анералу і энэргіі.

Адным з сур'ёзных тормазаў, якія перашкаджаюць рацыяналізацыі энэргацёпла-вытворчасьці і энэрга - выкарыстаньня зьяўляецца распыленасьць энэрга - гаспадаркі і адсутнасьць аб'ядноючага цэнтру. У радзе гарадоў БССР зараз ідзе праектаваньне і будаўніцтва электрастанцый капелень, ва электрыфікацыю адпускаюцца капітальныя ўкладаньні. Калі-б усе гэтыя работы праводзіліся адной арганізацыяй, можна было-б значна скараціць капітальныя затраты на самае будаўніцтва і ў далейшым зьнізіць эксплёатацыйныя выдаткі і з'эканоміць вялікую колькасьць энэргіі. Але энэрга-гаспадарка ў нас у БССР раскідана па розных ведамствах і арганізацыях у той час, як у цэнтры ўжо арганізаваны спэцыяльныя аб'яднаньні на электрабудаўніцтве (МАГЭС, Электраток і інш.).

Працаўнікі энэргабюро лічаць неабходным у першую чаргу стварыць рэспубліканскае электра-энэрга-аб'яднаньне, якое-б займалася эксплёатацыяй энэрга-гаспадаркі.

Да гэтага часу на нашых прадпрыемствах аддаецца вельмі мала ўвагі пытаньням барацьбы са стратамі цяпла і энэргіі. Да эканоміі выдаткаваньня апалу электраэнэргіі і пары ў нас па-сапраўднаму яшчэ ня прыступлена. Ня гледзячы на даныя дырэктывы, пры нашых прамысловых аб'яднаньнях і прыбуйных прадпрыемствах ня толькі ня створаны энэрга-ячэйкі, але нават адсутнічаюць спэцыяльна-вылучаныя людзі, якія-б сачылі за энэрга-гаспадаркай. У выніку мы маем нерацыянальнае, безгаспадарчае выкарыстаньне нашых апалавых і энэргетычных рэсурсаў.

На прадпрыемствах Лесбелу мы маем такія абураючыя факты, калі адкіды (анілкі і інш.) не скарыстоўваюцца, як апал, а выкідаюцца ў сьмецьце. Трэба адзначыць, што за вывяз гэтых адкідаў прыходзіцца плаціць грошы і займаць так не хапаючы нам транспарт.

У нас, як правіла, зусім адсутнічае які-б там ні было нагляд за энэргетычным абставліваньнем. Катлы па працягу доўгіх месяцаў ня чысьцяцца, апаратура забруджана і ніхто на гэта не зварачае ніякай увагі.

Адносіны да нагляду за электра-сеткай у большасьці гарадоў злачынна-нядбайныя і недапушчальныя. На станцыях пыл і бруд, у сетцы правадоў — зямля. Такая пастаноўка работы спрыяе стратам, і ў некаторых гарадох мы маем уцечку току ў сетцы да 45 проц. У выніку, электрычнасьць ледзь сьвеціць (Рэчыца, Слуцак і інш. гарады).

Са стратамі апалу і сілавой энэргіі неабходна навесьці рашучую барацьбу. Неабходна стварыць, па думцы работнікаў Энэргбюро, раённыя і групавыя энэргаячэйкі па рацыяналізацыі цёпла-сілавой і энэргетычнай гаспадаркі.

Інжынэры, тэхнікі і рабочыя агульнымі сіламі сумесна з бюро рацыяналізацыі і вытворчымі нарадамі павінны распрацоўваць пляны мерапрыемстваў па барацьбе са стратамі на энэргетычным фронце.

З усёй сур'ёзнасьцю трэба ўзяцца за справу і дабіцца чыстаты ў кацёльных, электрычных і сілавых памяшканьнях, не дапушчаючы ў іх бруду і пылу.

А.

БУДАЎНІЦТВА Ў КАЛГАСАХ

затрымліваюць парапелізм і арганізацыйныя непаладкі

Сёлета ў беларускіх калгасах вызначана разгарнуць вялікае будаўніцтва—гаспадарчае, індустрыяльнае і жыльлёвае. Агульная сума будаўніцтва ў калгасах, ужо наводзе скарочанага пляну, вызначаецца ў суме каля 20 млн. рублёў. З найбольш буйных аб'ектаў будаўніцтва можна адзначыць наступныя: сьвінаводныя гаспадаркі (некалькі ст), малочныя фэрмы, цялятнікі, крухмальныя, крухмальна - сушыльныя і крухмальна - таркавальныя заводы, пасады пад бульбу, раённыя склады-бані, трактарныя майстэрні, ванна - дралкі, ільна - апрацоўчыя заводы, а ксама 2 электрастанцыі ў Рагачэўскай і Магілёўскім і Лядзянскім агра-камбінатах (на 3.000 кілават кожная).

Асноўныя недахопы будаўніцтва ў калгасах — гэта адсутнасьць яснасьці ў пытаньнях фінансаваньня (асабліва на датычыцца сьвінаводных гаспадарак) і канчатковага пляну індустрыяльнага будаўніцтва. Да гэтага трэба дадаць вялікі паралелізм у рабоце. Ёсьць будаўнічыя апараты: у Калгасцэнтры, Галаводсаюзе, Малжысаюзе, Садсаюзе, яшчэ не гаворачы аб спэцыяльнай будаўнічай арганізацыі — Калгасбудзе. Такое-ж становішча мы маем і ў акруговых цэнтрах. Адсюль — распыленьне і сродкаў.

У выніку гэтага паралелізму здараецца наступнае: калгасу, напрыклад, трэба пабудаваць сьвіран, сілосную ўстаноўку, склеп для засолкі агуркоў. Каб трымаць кредыты і матар'ялы на гэтыя пабудовы яму трэба зьвярнуцца ў наступныя інстанцыі — для пабудовы сьвірна — у Паляводсаюз, сілоснай станоўкі — у Малжысаюз, склепу для агуркоў — у Садсаюз. Праўда, ёсьць нешто на паперы пункцік аб тым, што будаўніцтва ў такіх выпадках павінна канцэнтравацца ў галоўнейшым для дагэта раёну саюзе, але гэта не ажыцьцяўляецца.

Выхадам з такога становішча зьвяваюцца-б скаанцэнтраваньне ўсёй будаўнічай работы ў Калгасбудзе. Але пакуль-што Калгасбуд выказвае за-надта вялікую асьцярожнасьць і бярэ толькі на сябе невялікую колькасьць заказаў (усяго на 3 млн. руб.) — гэта ў мэтах самастрахоўкі.

Да гэтага часу работа Калгасбуду на месцах не адчувалася. Толькі зараз, пасьля таго, як на месцы былі пасланы тэхнікі і дзесятнікі, работа пачынае трошкі варушыцца. Ёсьць аднак шмат пунктаў, куды людзі не пасланы. Адчуваецца недахоп у каштарысах і рабочых чарцяжох.

У віну Калгасбуду трэба паставіць тое, што ён дасюль не арганізаваў у сяле адзелу масавай кансультацыі, дзе калгасы маглі-б атрымліваць тыповыя праекты, адказы на запытаньні, жывы інструктаж.

Калгасбуд у сваёй рабоце на першым кроку пачатку спатыкаецца з радам непаразуменьняў з Малжысаюзам і самімі калгасамі. Напрыклад, вызначаецца пункт для пабудовы малочнай фэрмы, а там аказваецца, вельмі дрэнна стаіць справа з водазабесьпячэньнем—трэба капаць глыбокія студні. Работа затрымліваецца. Было-б больш правільна і рацыянальна, калі-б пункты пад малочныя фэрмы вызначаліся бліжэй да вады, да рэкі. Або вось такія прыклады — Калгасбуд заключае дагавор на пабудову малочнай фэрмы. Калі яго працаўнікі прыяжджаюць на месцы, ім гаворыць: «не, будзем будаваць толькі кароўнік». Патрабуюць будаваць стайню, паветку, а на гэта сродкі не адпушчаны. У барбурыйскай прыгараднай фэрме прадстаўніку Калгасбуду заявілі — «вы нам не патрэбны, будзем будаваць самі, гаспадарчым спосабам.

Востры недахоп будаўнічых матар'ялаў выклікае неабходнасьць адшукваць шляхі і крыніцы для папаўненьня гэтага прабелу. Выхад тут, акрамя ўжываньня гліна-хвораставаго, глінабітнага і глінасаломнага будаўніцтва, заключаецца ў вырабе саматужна - прамысловымі і калгаснымі таварыствамі цэглы, ванны і гапчарных чарапіц з мясцовага сырцу. Але калгасы і саматужна - прамысловыя арцелі мала ўвагі ўдзяляюць гэтай справе. Галоўнае — у цэнтры зусім ня ведаюць, у якіх пунктах і колькі вырабляецца мясцовых будаўнічых матар'ялаў. Адсюль і затрудненьні з манэўраваньнем будаўнічымі матар'ялямі. Калгасцэнтр зрабіў спробу атрымаць такія весткі ад сваіх акруговых калгасаюзаў, але бяз посьпеху — саюзы не адгукнуліся.

У галіне забесьпячэньня будаўнічымі матар'ялямі мы сустракаемся яшчэ з радам ненармальнасьцяй, на якія трэба зьвярнуць увагу. Малжысаюзам адпускаецца ў плянавым парадку вызначаная колькасьць будаўнічых дэфіцытных матар'ялаў (цьвікі, цэмэнт). А на справе атрымліваецца вось што. Нарады на гэтыя матар'ялы Белсельгасснаб пасылае Паляводсаюзу для перадачы гэтых матар'ялаў Малжысаюзам. Атрыманыя па гэтых нарадах цьвікі і цэмэнт паляводсаюзаўцы ўжываюць на свае патрэбы, і Малжысаюзы застаюцца бяз гэтых матар'ялаў. На гэтай глебе ўжо назіраюцца крарывы, якія праз некаторы час могуць нашырыцца. З прычыны нястачы якіх-небудзь 20 яшчыкаў цьвікоў затрымліваецца пачатая пабудова масла-сыраводаў у Глуску, Грэску і інш. мясцох.

Наогул, скаргаў на Белсельгасснаб не абярэшся. Яшчэ зімой Паляводсаюз даў заяўку Белсельгасснабу на абсталяваньне для 3-х крухмальных заводаў, з дастаўкай яго да 1 мая. Але Белсельгасснаб на свой страх і рызыку заключыў дагавор з Белмэталятрэстам (не ведаміўшы аб гэтым Беляпяводсаюз) на дастаўку гэтага абсталяваньня часткамі да 1-га лістапада. У выніку гэтага дастаўка абсталяваньня спазьняецца і будаўніцтву крухмальных заводаў, якія павінны быць скончаны на працягу гэтага лета, пагражае зрыў.

Белсельгасснаб выпісвае ванну з далёкага Крыму, а тут нічога ня робіцца для ўзмацненьня вырабу ванны з мясцовага сырцу (для чаго маюцца ўсе магчымасьці), і закрываецца палацкі ванняны завод. Апрача таго, Белсельгасснаб перавозіць ванну ў тыя раёны і акругі (напрыклад, у Воршу), дзе ёсьць ванна мясцовага вырабу і няма патрэбы ў яе завозе.

Неабходна самым рашучым і катэгарычным чынам выправіць тыя ненармальнасьці, якія ўжо на першым пачатку затрымліваюць тэмп і пасьпяховасьць будаўніцтва ў калгасах.

Л. Н—даў.

З лістоў рабселькораў

ПАДРЫВАЮЦЬ КАНТРАКТАЦЫЮ

Дрыбенскія каапэратары падрываюць справу кантрактацыі маладняка. Каб атрымаць селяніну пару ботаў, дык трэба здаць каапэрацыі цялячую скурку.

Акрамя таго каапэрацыя заахвочвае здатчыкаў, каб апошнія больш здавалі цялячых скурак.

САМУСЕВІЧ.

САНКАМІСІЯ, ДЗЕ ТЫ?

На рынку зараз шмат розных сельскагаспадарчых прадуктаў: масла, малака, рознага мяса і інш. Часта маюць месца такія факты, калі ў малако традляецца вада, у масла ўкладваецца гліна ці што іншае. Нельга таксама даведацца, якое прадаецца мяса. На гэта трэба санагляду зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу і сыстэматычна рабіць аналіз прадуктаў, якія прывозяцца на рынак.

К.

РАСТРАТЧЫКАЎ ПАКАРАЦЬ

Касірам Касьцюковічам з саматужнай арцелі «Чырвоны Кастрычнік» (Конысь) зроблена растрата 269 руб. На працягу году зроблены чатыры растраты. Аб гэтых растратах ведае загадчык арцелі і рэвізійная камісія, але ніякіх мер пакуль што ня прынята.

Хто павінен адказаць за растрату?

Р.

ЧАС ПАЧАЦЬ ЗАНЯТКІ

Пры заводзе імя Ланцуцкага са школы ФЗК зроблен датэрміновы выпуск 2-х старэйшых груп фабрычна-заводзкага вучнёўства і 2-х груп брыгаднага вучнёўства. Замест выпушчаных кваліфікаваных рабочых школай зроблен новы набор 6-ці груп. Гэтыя групы павінны былі пачаць заняткі і красавіка, але аддзел асьветы Заходніх чыгунак не адпусьціў патрэбных сродкаў на ўтрыманьне гэтых груп. Заняткі не пачаліся.

Час пачаць ужо заняткі.

К. Я.

ПРАТЭКЦЫЯНІЗМ У САМАХВАЛАВІЦКІМ РВК

На пасадзе загадчыка Самахвалавіцкай райбібліятэкі працавала на працягу двух год Бэйдзіна. Зараз РВК яе зьняў з работы з тым, што як быццам яе назначаюць загадчыцай нардому, а на яе месца па пратэкцыі прынята жонка начальніка міліцыі. Але на справе вышла зусім іншае. Бэйдзіну пасылаюць на працу ў Дудзіцкую хату-чытальню.

Трэба высьветліць, хто займаецца пратэкцыянізмам.

СЕЛЬКОР.

Падрыхтоўка да уборачнай кампаніі не пачата

РАМОНТ УБОРАЧНЫХ МАШЫН ПАКУЛЬ НЕ ЗАБЯСЬПЕЧАНЫ

„Чырвоны Мэталісты" адгрузіў толькі 30,4 проц. пляну на акучніках

Беларускія зямельныя і калгасна-каапэрацыйныя органы не даацэньваюць значэньня асабліва сёлетняй уборачнай кампаніі. Спасылаючыся на кліматычныя ўмовы БССР, на тое, што ў Беларусі ўборачная кампанія пачынаецца значна пазьней, чым у іншых раёнах Савецкага Саюзу, яны лічаць, што з гэтай справай можна яшчэ пачакаць. Бясспрэчны факт — ні НКЗ, ні Калгасцэнтр БССР яшчэ нават не абмеркавалі раду важнейшых спэцыфічных пытаньняў, зьвязаных з уборачнай кампаніяй.

Гэтымі органамі, такім чынам, зусім ня ўлічваюцца тыя асаблівасьці, якія ўласьцівы сёлетняй уборачнай кампаніі і ў БССР. Сюды адносіцца напрыклад, такое пытаньне, як разьмеркаваньне сенажацяй сярод калгасаў і індывідуальнікаў. Калі да гэтай справы ня прыступіць зараз-жа, дык мы будзем мець затрыманьні ў рэалізацыі сенажацяй.

Ня прымаецца пад увагу таксама і тое, што беларускія калгасы, якія апрацоўваюць 18 проц. усёй яравой плошчы рэспублікі, маюць значную колькасьць пасеву пад прапашныя культуры. Між тым, аб арганізацыі прапашкі гэтых культур ніхто ня думае.

Ва ўмовах БССР уборка коласавых культур супадае з асеньнімі палявымі работамі. Гэта яшчэ больш ускладняе як уборачную кампанію, так і асеньнюю сяўбу, асабліва ў калгасах. Добра справіцца як з уборкай коласавых, так і з асеньняй сяўбой можна толькі ў тым выпадку, калі загадзя, як належыць, падрыхтавацца. Між тым, зямельныя і калгасныя органы ня ўлічваюць гэтага і пакуль што нічога канкрэтнага ня робяць, каб зараз-жа скласьці надрабязны плян уборачнай кампаніі.

Асобна трэба спыніцца на арганізацыі рамонту ўборачных машын і інвэнтару. Выяўляецца, што і ў гэтай галіне ў нас ня ўсё стаіць добра. Сваячасовы рамонт уборачных машын і інвэнтару пакуль што не забясьпечаны. Вось даныя, якія гэта сьцьвярджаюць. Сёлета ў БССР павінна было быць арганізавана новых 150 рамонтных майстэрань. Да гэтага часу створана толькі 30 — плян выкананы на 20,4 проц. Акрамя таго, трэба адзначыць, што арганізаваныя майстэрні фактычна зьяўляюцца звычайнымі кузьнямі, якія ня могуць выканаць складаны рамонт. Павінны былі быць арганізаваны 24 мэханічныя майстэрні, але ні адной з іх яшчэ няма.

Карысна было-б скарыстаць для складанага рамонту чыгуначныя майстэрні. Аднак, і ў гэтай галіне пакуль што ніякіх крокаў ня ўжыта.

Плян арганізацыі рамонтных майстэрань ускладняецца яшчэ тэй акалічнасьцю, што вельмі слаба выконваецца плян завозу рамотных інструмантаў. Замест 122 камплектаў інструмантаў завезены толькі 64 камплекты.

Урэшце, трэба адзначыць невыкананьне заданьня па выпрацоўцы акучнікаў (інвэнтар для прапашкі бульбы) віцебскім заводам «Чырвоны Мэталісты». Да 1-га мая завод павінен быў адгрузіць 9.200 акучнікаў, адгружана-ж — толькі 2.820 — 30,4 проц. пляну.

С. Г.

Завоз уборачных машын

Плян завозу ў БССР уборачных машын выконваецца ня зусім здавальняюча.

Больш-менш здавальняюча стаіць справа толькі з сенакасілкамі і жняярками, самаскідкамі, якіх па 9-е мая завезена першых 667 штук — 79 проц. пляну і другіх 1.512 штук — 65 проц. пляну. Зусім іншы малюнак па рэшце машын. Так, конных снопавязалак завезена 10 замест 250 (8 проц.), конных грабель — 151 замест 824 (18 проц.), трактарных снопавязалак 10 замест (165 проц.), трактарных бульбакапацеляў 18 замест 53 (34 проц.).

Зусім не завезена яшчэ ільна-церабільных машын, конных бульбакапацеляў і трактарных сенакасілак.

Трэба прыняць свалчасовыя меры для поўнага забесьпячэньня ўборачнай кампаніі сельска-гаспадарчымі машынамі.

На барацьбу за прамфінплян

Прафарганізацыі Барысава—сьпіной да вытворчасьці

Вынікі 3-яй агульна-гарадзкой канфэрэнцыі

Па барысаўскіх фабрыках і заводах у мінулым паўгодзьдзі адзначана многа крарываў. Амаль усе фабрыкі і заводы недавыканалі прамфінпляну.

Вынікі гэтай работы падвяла 3-я агульна-гарадзкая канфэрэнцыя. З кароткага дакладу т. Валуева на гэтай канфэрэнцыі відаць, што «Чырвоная Бярэзіна» за паўгодзьдзе недавыканала 10 проц. праграмы. Такім чынам, дзяржава не атрымала 15.000 скрынь запалак. Гута імя Домбаля недавыканала сваёй праграмы па 3 проц.

«Чырвоная Бярэзіна» замест зьніжэньня сабекошту на 13 проц., павысіла яго на 4 проц., зав. «Каміцэрні» таксама павысіў сабекошт. Гута імя Домбаля недавыканала заданьня па зьніжэньні сабекошту на 2,62 проц.

Гэтыя процанты недавыкананьня прамфінпляну гавораць аб тысячах страчаных рублёў.

Дзе-ж прычыны такога небясьпечнага становішча з выкананьнем прамфінпляну па барысаўскіх прадпрыемствах? На гэтае запытаньне даюць адказ рабочыя, выступаўшыя ў спрэчках.

У спрэчках адзначалася, што прафарганізацыі Барысава шчэ да гэтага часу не павярнуліся тварам да вытворчасьці. Яны ня кіруюць ударніцкім рухам. Мітынговае кіраўніцтва не дапамагае працы, а толькі развальвае ўдарныя брыгады. Ударныя брыгады ня маюць сталага кіраўніцтва і падліку дасягненьняў. Наміж брыгадамі няма канкрэтных дагавароў.

З прычыны адсутнасьці кіраўніцтва спаборніцтвам на гуце імя Домбаля прагулы растуць з кожным днём, некаторыя камсамольцы таксама не адгаюць ад прагульшчыкаў. Цікучасьць рабочых на заводзе навялічылася ў чатыры разы супроць кастрычніка мінулага году. Расьце таксама колькасьць звышнормавых работ.

На тэкстыльнай ф-цы 40 рабочых абвясьцілі сябе ўдарнікамі. Заўком узяў сьпіс ударнікаў і згубіў яго. Да гэтага часу не вядома хто зьяўляецца ўдарнікам. На шматразовыя просьбы ўдарнікаў вывяць выніклі іх працы заўком махнуў рукою.

Заўкомы не дапамагаюць весьці барацьбу з гультаямі, п'яніцамі, прагульшчыкамі і шкоднікамі, якія лічацца ва ўдарных брыгадах.

— Побач са мной працуе работніца—кажа т. Вароўка («Чырвоная Бярэзіна») — якая лічыла сябе ўдарніцай, а калі ёй не далі прэміі, дык яна зноў пачала працаваць па-старому. На фабрыцы нарэзалі 2 скураныя пасы ад варштату і разьнесьлі іх дамоў на падэшвы. Такіх шкоднікаў многа.

Часта бывае, што прафарганізацыі не дапамагаюць гаспадарнікам весьці барацьбу са шкоднікамі, тым самым яны не садзейнічаюць правядзеньню ў жыцьцё адзінаначальня. Адна работніца атрымала 2 вымовы за парушэньне працдысцыпліны. У трэці раз яна недавыпрацавала кругу паперы і падлажыла яго ў шафу другой работніцы. Загадчык цэху ня даў ёй працы, а цэхпрафбюро выносіць пастанову прыняць яе зноў на працу (?). І такіх выпадкаў ёсьць шмат.

Увогуле ўсе гэтыя факты даюць яскравы малюнак, як прафарганізацыі Барысаўшчыны адносяцца да сацспаборніцтва. Таму ня дзіва, што пастановы 2-й агульна-гарадзкой канфэрэнцыі засталіся на паперы. Прагулы, дрэнная якасьць прадукцыі і брак засталіся ня зьнішчанымі на сёнешні дзень. Прафарганізацыі барысаўскіх прадпрыемстваў не падтрымалі жаданьня рабочых ліквідаваць прарывы ў выкананьні прамфінпляну.

СОКАЛАЎ.

У барацьбе за пераходны сьцяг

Лесазавод «Калектыўная Праца» (Нова-Беліца, Гомельскай акругі) лічыцца ўдарным заводам. Амаль усе 367 рабочых знаходзяцца ва ўдарных брыгадах. Рабочыя першыя добраахвотна зьнізілі расцэнкі, ушчыльнілі рабочы дзень. Цэх з цэхам спаборнічае па заваёву пераходнага сьцягу.

Здавалася, што пры такіх умовах можна выканаць прамфінплян са значным перавышэньнем. Але для гэтага не хапае аспэчнага — кіраўніцтва і гібкасьці заводзкіх арганізацый у падтрыманьні ініцыятывы калектыву.

Вытворчая праграма выконваецца заводам наступным чынам: на лесапільным цэху — на 104,44 проц., на стружачным цэху плян таксама перавыканаць. Адстае толькі адзін бачарны цэх, у якога прарыў дасягае вялізарных разьмераў: сабекошт прадукцыі замест зьніжэньня на 13 проц. павышаны на 13 проц. З гэтай прычыны сабекошт па ўсім заводзе зьніжаны ўсяго на 8 проц.

Выклікае ўвагу значны рост прастояў. За паўгодзьдзе завод прастаяў 420 гадзін і недавыпрацаваў 45 вагонаў прадукцыі. Характэрна адзначыць прычыны прастояў. 42 гадзіны завод стаяў з прычыны нястачы пары, таму што несвачасова быў паданы апал. Зьнішчэньне гэтага недахопу цалкам залежала ад адміністрацыі. 119 гадзін завод прастаяў з прычыны несвачаснай дастаўкі сырцу. Гэта таксама цалкам залежала ад адміністрацыі.

Значна адбілася на выкананьні прамфінпляну астаноўка бачарнага цэху. У гэтай справе вялікую ролю адыграла галавацяпства заводакіраўніцтва, якое адразу згадзілася з прапановай трэсту спыніць работу цэху, як быццам, з прычыны нястачы сырцу, між тым, як сырцу хапіла бы яшчэ надоўга. Праз месяц зноў прышлося адчыніць бачарны цэх, але замест двух зьмен пусьцілі толькі адну, бо ўжо ня было рабочых, яны разышліся па іншых прадпрыемствах.

Заводакіраўніцтва ня выконвае сваіх абавязацельстваў на саддагаворы. Рацыяналізатарскія мерапрыемствы не ажыцьцяўляюцца. Нават прысланы мэханізаваны стружачны прэс празімаваў па двары. Заводакіраўніцтва ня выконвае прапаноў рабочых, шкадуючы фондпрэм'яваньня. Безгаспадарчасьць складу моцна б'е па прамфінпляне. Усюды гніе матар'ял. Цэлымі тыднямі ня грузяць яго, ня гледзячы на наяўнасьць нарадаў.

Вось асноўныя моманты, якія затармазілі перавыкананьне прамфінпляну і заданьне па зьніжэньні сабекошту. Між тым, рабочыя на гэтыя моманты шмат разоў паказвалі адміністрацыі. Але намочнік дырэктара, ён жа рацыяналізатар, т. Каратке́віч не прыслухоўваецца да рабочых прапаноў і бадай на кожную параду адказвае грубасьцю.

Прамфінплян да рабочых не даведзены. Дырэктыва партыі аб адзінаначальні ня выканана. Няма абмену вопытам з заводам імя Томскага, з якім заключаны саддагавор. Саддагаворам ахоплены толькі кваліфікаваныя рабочыя, між тым, ударнікамі лічаць сябе ўсе.

Заводзкія арганізацыі, асабліва, заўком, які яшчэ не даволі цікавіцца вытворчасьцю, павінны шырэй разгарнуць масавую работу і дабіцца перавыкананьня прамфінпляну ва ўсіх яго паказальніках.

С. СЫРКІН.

Праверым работу прадпрыемстваў, якія перайшлі на 7-гадзінны рабочы дзень

Без падрыхтоўкі

Рабочыя заводу «Дрэваапрацоўшчык» чэта пыталіся ў сваіх кіраўнікоў:

— Калі наш завод будзе пераведзены на 7-мігадзінны рабочы дзень?

— Ня ведаем — быў адказ.

А адзін з прыгожых дзён, у канцы студзня, на дзьвярох заводзкай канторы бы прыклеены плякат, на якім вялікімі літарамі паведамлялася:

«Сёньня, а 5-й гадз., у клюбе гарбароў адбудзецца сход па пытаньні аб пераходзе нашага заводу на 7-гадзінны рабочы дзень з 1-га лютага бягучага году».

Чыталі рабочыя гэты плякат і зьдзіўлена назіралі адзін на другога.

— Як жа гэта так? — пыталіся яны— без усякай падрыхтоўкі? Бюро рацыяналізацыі сьпіць, НТБ таксама, новыя нормы і расцэнкі нашэ не выпрацаваны — і вось табе а, пераходзім...

Непаразуменьне было настолькі вялікае, што некаторыя рабочыя нават думалі, што ім зьменшаць заработак у сувязі з пераходам на 7-гадзінны рабочы дзень. Спрачаліся рабочыя, крычалі, зноў спрачаліся, а чарам усе пайшлі ў клюб гарбароў.

Адкрыў сход стар. Уступнае слова было сьпіня заўкому. Тычнай важнасьці пераведзена палі ны рабочы дзень. Аб г у на 7-гадзінны лі і іншыя таварышы. -жа гаварылі, мінаў аб тым, што нічога то не ўспадрыхтоўцы да пераходу, сказана аб не сказаў, што пры 7-гадзінным рабочым дні трэба ўшчыльнім рабочы дзень, падняць працдысцы-ну, выканаць прамфінплян і з карысьцю для сябе, для свайго культурнага адзьця скарыстаць 8-ю гадзіну пасьля рабочага дня.

ДРУКУЮЧЫ ПЕРШУЮ КАРЭСПАНДЭНЦЫЮ АБ ВОПЫЦЕ ЗАВОДУ «ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫК», РЭДАКЦЫЯ ЗВАРАЧАЕЦЦА ДА РАБКОРАЎ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, ЯКІЯ ПЕРАЙШЛІ НА 7-ГАДЗІННЫ РАБОЧЫ ДЗЕНЬ З ПРОСЬБАЙ — АСЬВЯТЛІЦЬ НА СТАРОНКАХ «ЗЬВЯЗДЫ» ВОПЫТ РАБОТЫ СВАІХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ.

Адным словам, вечар скончыўся пастаноўкай, рабочыя разышліся з тымжа запасам ведаў аб практычным ажыцьцяўленьні пераходу на 7-гадзінны рабочы дзень, з якім яны прышлі на сход.

Люты працавалі «па-новаму». І калі падвялі вынікі месячнай работы, аказалася, што... лесапільны цэх недавыканаў вытворчай праграмы на 12 проц., а мэблявы цэх — на 13 проц.

І вось, калі газэты пачалі пісаць аб прарыве на «Дрэваапрацоўшчыку», толькі тады кіраўнікі заводу ўсьвядомілі, што ня трэ' было падыходзіць пагалавацінску да надзвычай сур'ёзнай справы, як пераход прадпрыемства на новыя формы работы.

І што-ж вы думаеце? Можа заводзкія арганізацыі адразу пачалі выпраўляць свае памылкі? Не. З гэтым яны не спяшаліся.

Вакол прарыву трэба было мабілізаваць увагу рабочых і заводзкіх арганізацый. Трэба было давесьці плянавыя заданьні да кожнага рабочага, забясьпечыць прадпрыемства адпаведнай колькасьцю кваліфікаваных рабочых і правільна іх скарыстаць, трэ' было растлумачыць кожнаму рабочаму яго абавязкі ў сувязі са скарачэньнем рабочага дня. Гэтага зроблена ня было. І цяпер яшчэ на першай зьмене працуюць лепш кваліфікаваныя рабочыя, а на другой зьмене — менш кваліфікаваныя, замест таго, каб разьмеркаваць рабочых так, каб менш кваліфікаваныя рабочыя маглі вучыцца ад лепшых. Другая зьмена наогул зьяўляецца некім пасынкам і нават пазбаўлена зьменнага партыйнага і прафэсыянальнага кіраўніцтва.

— Мы слаба працуем — кажа намесьнік старшыні заўкому тав. Кастрыцкі, — і толькі, мусіць, таму мы ўвесь час маем недавыкананьне прамфінпляну.

На пытаньне:

— Чым занята ў вас 8-я гадзіна, пасьля работы? — тав. Кастрыцкі адказвае:

— Нічым. Як і раней робім сходы, пасяджэньні, і наогул у нас памяшканьне невялікае, а колькасьць рабочых у нас расьце — ужо зараз 400 чалавек.

А сакратар парткаелктыву даў такую ацэнку прафрабоце:

— Прафсаюзная работа вядзецца ў нас па-старому, чакаем перавыбараў заўкому, тады пяройдзем на новыя формы работы (дарэчы, такая дырэктыва была дадзена ЦП саюзу).

Вось чаму завод «Дрэваапрацоўшчык» увесь час ня выконвае сваёй вытворчай праграмы.

Трэба спадзявацца, што адноўлены «трыкутнік» выправіць памылкі, якія былі дапушчаны старым «трыкутнікам». А выправіць памылкі можна толькі тады, калі сапраўды пабальшавіцку ўзяцца за работу.

А. МАНЬКОЎ.

ЛЯДНЯНСКІ ПРАРЫЎ НЕ ЛІКВІДАВАНЫ

У Лядзянскім раёне пры калектывізацыі былі дапушчаны грубыя парушэньні партыйных дырэктыў. Замест растлумачэньня бядняцка-серадняцкім масам сутнасьці калектывізацыі, замест арганізацыі батрацка-бядняцкіх мас, лядзянскае кіраўніцтва займалася дэкрэтаваньнем калгаснага руху зьверху, голым адміністраваньнем, імкненьнем пераскочыць праз сельска-гаспадарчую арцель адразу да камуны. Ужываліся мэтады нагроз тым, хто не хацеў запісвацца ў калгас. Ёсьць рад фактаў, калі беднякоў пазбаўлялі выбарчага права за тое, што яны не запісваліся ў калгасы.

Раскулачваньне не праводзілася на базе калектывізацыі. Спачатку раскулачвалі, а потым калектывізавалі. Апрача таго пры раскулачаньні быў закрапут і серадняк.

Усе гэтыя грубыя скажэньні клясавай лініі і парушэньні партыйных дырэктыў, якія рабіліся на вачох раённага кіраўніцтва, спрыялі антыкалгаснай агітацыі кулакоў.

У той-жа час ніякай работы па замацаваньні арганізаваных калгасаў не вялося. Работа з беднатой, якая ўступіла ў калгасы, не праводзілася.

Пасьля зьмяшчэньня ў друку артыкулу т. Сталіна «Галавакружэньне ад посьпехаў» і пастановы ЦК УсеКП(б) аб парушэньнях партдырэктыў у калгасным будаўніцтве, мясцовыя арганізацыі спалохаліся. Але ў іх не хапіла бальшавіцкай мужнасьці прызнаць памылкі, выправіць іх і пачаць работу па замацаваньні калгасаў, захоўваючы поўную добраахвотнасьць. Раённыя работнікі ўжывалі і далей мэтады адміністраваньня і пагроз. Так, 8 красавіка сакратар райкому Байдакоў і аграном Сапега, праводзячы сход у в. Хаўдзях, стукалі кулакамі па стале і пагражалі адвесьці горшыя землі некалгасьнікам. Пры адводзе зямлі калгасам праводзілася мэханічна 25-процантная абрэзка зямлі ў некалгасьнікаў. Пры «выпраўленьні» перагібаў у некаторых вёсках пазбаўлялі пяўступіўшых у калгасы сенажаці, прагонаў, вадапояў і г. д. (Рудашкова, Казьлены). Гэтае адміністраваньне спрыяла распаду яшчэ некалькіх калгасаў, якія ўжо пачалі былі сець.

Характэрна, што ўсе гэтыя перагібы былі выпраўлены толькі тады, калі пасьля заявы сялян, паданай у Наркамзем, прыехаў прадстаўнік АВК.

Сяўба ў раёне знаходзіцца пад вялікай пагрозай. Так, па 5 мая калгасамі было засеяна 431 гэкт. яравога кліну або 13 проц. пляну; індывідуальным сэктарам засеяна па 5 мая 885 гэкт., або 10 проц. пляну. Між тым, раённыя арганізацыі, а таксама і сельсаветы ня прымаюць ніякіх мер, каб паскорыць ход сяўбы. Пашырэньне пасеўнай плошчы як у калгасах, так і ў індывідуальных гаспадарках—пад вялікай пагрозай. Пасеўныя пляны да паасобнага двара не даведзены. Плян сяўбы нават не даведзен да сельсавету. Сяўбой ніхто ня кіруе. У калгасах яна праводзіцца бяз пляну. Сеюць, дзе што напала, бо рабочых плянаў няма.

Яшчэ і да гэтага часу групы беднаты пры калгасах існуюць на паперы. Ніякай працы з беднатой не праводзіцца.

Райком партыі аб усіх гэтых недахопах досыць інфармаваны, але ніякіх мер да зьнішчэньня іх ня прымае.

Цікава адзначыць, што за скрыўленьне клясавай лініі пры калектывізацыі, за грубае парушэньне дырэктыў партыі ніхто не панёс пакаранья. Аршанскі акругком партыі абмежаваўся толькі тым, што адклікаў сакратара райкому т. Байдакова і старшыню РВК—т. Тодарава.

Трэба палажыць канец усім гэтым недапушчальным зьявішчам, якія да гэтага часу яшчэ там не ліквідаваны. Трэба безадкладна выправіць дапушчаныя памылкі.

Брыгадзір «Зьвязды»
МІНОВІЧ.

Тэмп вярбоўкі ў вайсковыя школы слабы

Правядзем вярбоўку пад знакам масавай кампаніі

Падцягнуць вярбоўку ў вайсковыя школы

У цэнтральным армейскім органе «Красная Звезда» зьмешчана перадавая, якая гаворыць аб тым, што вярбоўка ў вайсковыя школы ідзе навольна, пяроўнамерна. Яшчэ толькі ў Чырвонай арміі гэта работа праведзена больш-менш здавальняюча.

Для ўсіх ясна, што сацыялістычнае будаўніцтва павінна быць надзейна абаронена. А дзеля гэтага трэба ў першую чаргу забясьпечыць падрыхтоўку начальніцкага складу РСЧА.

«Красная Звезда» гаворыць, што «для вайсковых школ патрэбны ня многія тысячы, што складае назначную на колькасьці частку агульнай патрэбнасьці сацыялістычных кадраў». Так што тыя вялікія задачы, якія лажацца на партыю і рабочую клясу ў сацыялістычнай рэканструкцыі гаспад

Дабрабыт гор. Менску патрабуе ўвагі

Трэба канстатаваць, што да пытаньняў гарадзкога дабрабыту, зьвязаных з паляпшэньнем санітарна-бытавых умоў гарадзкога працоўнага насельніцтва, ня прыцягнута ў патрэбнай меры ўвага нашай рабочай грамадзкасьці.

Правільнае і сыстэматычнае разьвіцьцё дабрабыту ў гор. Менску тармозіць адсутнасьць сучаснага і правільнага пляну гораду. У нас дагэтуль карыстаюцца плянам гор. Менску, складзеным... 10 год назад гарадзкою ўправаю. Некалькі год назад успомнілі аб неабходнасьці складаньня пляну гор. Менску. Выпісалі вядомага знаўцу па пляніраваньні гарадоў прафэсара Сімёнава, выдаткавалі некалькі тысяч рублёў, але потым махнулі рукой і на гэту справу...

У гарсавеце, у акрвыкашкоме вы сустрэнецеся са стэрэатыпным адказам— **няма грошай на складаньне пляну...** Між тым, ёсьць пастанова НКУС, зацьверджаная СНК, аб тым, каб гарадзкія саветы прадугледжвалі ў сваіх кашторысах асыгнаваньні на складаньне плянаў гарадоў. Некаторыя гарсаветы (Гомель, Бабруйск) ужо асыгнавалі на гэту мэту нейкія сумы і прыступілі да складаньня плянаў сваіх гарадоў. Менск — сталіца БССР, якая буйна разгортваецца і пашыраецца — топчацца на адным месцы і не пачынае работы на пляніраваньні гораду.

Менск пашыраецца і забудоўваецца няправільна, часамі стыхійна. Узяць хаця-б такі факт, **як пабудова унівэрсытэцкага гарадка і унівэрсытэцкіх клінік у розных канцох гораду.** У нас ёсьць пяцігодка па ўсіх галінах народнай гаспадаркі, а **пяцігодкі па гарадзкой гаспадарцы,** па гарадзкім дабрабыце няма. Гэта недапушчальны прабел, які трэба выправіць.

Пройдзем да асобных пытаньняў гарадзкога дабрабыту.

Мінулым летам у Меску, з-за ўсялякіх раскопак вуліц (патрэбных і непатрэбных) жыхары досыць наглыталіся пылу і пяску. Тады давалі тлумачэньне— будуецца трамвай, каналізацыя, нічога ня зробіш, трэба пацярпець. Цярпелі. Зараз зноў «самумы» пяску, хмары пылу.

Вуліцы не паліваюцца, пылососы не функцыяноуюць. Гарсавет і камгас адносіцца да гэтай справы з алімпійскім спакоем, быццам іх гэта не датычыць.

Нават цэнтральныя вуліцы, дрэнна выбрукаваны. Гарсавет скэптычна адносіцца да пракладкі асфальтавага або клінкернага бруку (нямецкая, моў рэч) і вельмі прыхільны да забрукаваньня вуліц брусчатым (шпічатным) каменем, але гэта вымат каштуе. **І пакуль што мы ня маем ні асфальту, ні клінкеру, ні брусчатага каменю, а бачым толькі паразварочваныя булыжнікі.**

Вуліцы Менску вельмі—вузкія, дрэнна распляніраваны, і зусім не датасаваны да таго вялікага грузавога і вулічнага руху, які ў нас зараз назіраецца,—таму так шпарка і псуецца брук, што грузавы рух праходзіць па адной калёі вуліцы, ад таго так цесна нашаму трамваю па цэнтральных вуліцах. Але новае распляніраваньне і пашырэньне старых вуліц — гэта справа доўгая, разьлічаная на многа гадоў. Зараз-жа трэба выкарыстоўваць усялякія мажлівасьці для таго, каб пашырыць хаця-б некаторыя вучасткі.

Нядаўна была магчымасьць пашырыць самы шматлюдны вучастак Савецкай вул. ад Ленінскай да вул. Энгельса. **Пры пабудове новага дому Дзяржбанку адыйшлі ў глыбіню ад старой лініі вуліцы. Тое самае можна было зрабіць пры пабудове новага кіно-тэатру, які будуецца тут-жа побач.** Але гэты выпадак ня быў выкарыстаны. З-за грашовай эканоміі было вырашана не адыйсьці ад старой лініі вуліцы і не разьбіраць фасаднай сьцяны старога дому. Як гарсавет і камгас маглі дацупіць, каб новы кіно-тэатр укліньваўся, урэзваўся ў лінію вуліцы, як мог прапусьціць такі плян будаўніцтва гарадзкі архітэктар? Гэта нядбайнасьць, нічым не апраўданая скупасьць ставіць крыж на мажлівасьць нават у будучым пашырыць гэты самы шматлюдны вучастак гораду.

Рака Сьвіслач не карыстаецца добрай славай. Патрэбна было-б паглядзець, увесьці яе ў патрэбныя рамкі, г. зн. **пабудаваць узьбярэжныя, дамбы,** бо зараз мы маем такое становішча, што непабудаваныя, незамацаваныя берагі расьпяюцца, распаўзаюцца, і людзі амаль што ў раку не пападаюць. Трэба было-б таксама пабудаваць для купаньня і абсталяваць некалькі купалень для гарадзкога насельніцтва. Гэта таксама ня робіцца.

У горадзе бязьлітасна высякаюцца і зьнішчаюцца сады. Не разьбіраюцца, ці гэта выклікаецца вострай неабходнасьцю. Кантроль тут настаўлен вельмі слаба. У выніку мы пазбаўляемся і тых скупых зялёных насаджэньняў, якія ў горадзе ёсьць. З другога боку, вельмі слаба праводзяць новыя дрэвасаджэньні. Да гэтай справы ня прыцягваецца ўвага вучнёўскай і пінэрскай моладзі. **Адзіны** гарадзкі сад і малалікія скверы дрэнна ўтрымліваюцца, не абсталяваны, як сьлед, і не ахоўваюцца. Меркавалася абсталяваць парк у Антонаўцы і злучыць яго з горадам аўтабусным рухам. Але і гэты праект пакуль што ня рухаецца з месца і не ажыцьцяўляецца.

Трэба адкінуць пагардлівыя адносіны да пытаньняў гарадзкога дабрабыту і прыцягнуць да гэтай справы ўвагу рабочай грамадзкасьці. **Сталіца Савецкай Беларусі павінна паставіць свой дабрабыт на належную вышыню.** Мы адшукалі мільённыя сумы на пабудову трамваю, каналізацыі і г. д. Трэба адшукаць дадатковыя сродкі на прывядзеньне гораду ў належны стан. Справа ня толькі ў грашовых сродках. Патрэбны грамадзкая ініцыятыва, грамадзкі кантроль.

Л. НЯФЕДАЎ.

За дзень

Культбытавая камісія Белжылсаюзу пастанавіла правесьці падлік усіх нябісьменных і адкрыць да 20-га мая ва ўсіх жактах лікпункты.

МЦРК арганізаваў двухтыднёвыя курсы для падрыхтоўкі буфэтчыкаў. Усе курсанты прымацаваны да буфэтаў для практыкі.

МЦРК адкрыў 14 новых буфэтаў на больш буйных пабудовах Менску.

Наркампрацы па згодзе з ЦСПСБ і ВСНГБ пастанавіў даваць, пачынаючы з 15-га мая, чарговы водпуск рабочай моладзі, якая едзе на экскурсію на Украіну, арганізаваную рэдакцыяй газэты «Чырвоная Зьмена».

Экскурсіі, якія жадаюць наведаць Асінбуд, абавязкова павінны загадзя паведамляць кіраўніцтва Асінбуду за 8-10 дзён да аб'езду. Памяшканьні для начлегу экскурсантам даваццa ня будуць.

Сёлета летам ў калгасах і саўгасах Беларусі будзе адкрыта 1.000 дзіцячых яслёй для дзяцей калгасьнікаў, саўгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства.

Для працы ў яслях будуць пасланы падрыхтаваныя працаўнікі (100 чалавек), якія скончылі спэцыяльныя курсы.

***

У гэтым годзе ва ўсіх гарадох Беларусі пры акруговых дзіцячых кансультацыях будуць адкрыты дзіцячыя пляцоўкі для грудных дзяцей. На пляцоўкі у першую чаргу будуць прымацца дзеці рабочых, якія атрымліваюць малую пэнсію і жывуць у дрэнных кватэрных умовах.

***

Наркампрацы сумесна з НКА адкрывае 20-га мая ў Менску курсы па падрыхтоўцы рабочай і батрацка-бядняцкай моладзі у школы ФЗУ. Курсы разьлічаны на 230 чалавек. Тэрмін навучаньня на курсах — 4 месяцы.

НА ПЛЕНУМЕ САЮЗУ ЧЫГУНАЧНІКАЎ

Гэтымі днямі адбыўся пленум ЦП саюзу чыгуначнікаў, на якім пастаноўлена аб'яднаць менскую і аршанскую страхкасы чыгуначнікаў. Галоўнае кіраўніцтва аб'яднаўшымі страхкасамі будзе знаходзіцца ў Оршы. У Менску застанецца толькі ўпоўнаважаны страхкасы і даверанны доктар. Аб'яднаньне дапаможа зьнішчыць чаргу і палепшыць абслугоўваньне чыгуначнікаў.

ТЭМП СПЛАЎНЫХ РАБОТ ЯШЧЭ СЛАБЫ

Адстаюць Барысаўскі, Чэрвенскі, Полацкі і Бабруйскі раёны

Усяго на рэках БССР у гэты сплаўны сэзон павінна быць выплаўлена 1.455.000 кубамэтраў лесаматар'ялу.

Паводле папярэдніх даных, па сплаўных рэках пушчана ў сплаў каля 1.100 тыс. кубамэтраў або 74 проц. Прымаючы пад увагу, што пэрыяд сплаву вельмі кароткі з прычыны малаводзьдзя паных рэк, такі тэмп сплаву ні ў якім разе нельга назваць здавальняючым.

На асобных акругах сплаў характарызуецца наступнымі лічбамі:

У Бабруйскім раёне ад пачатку кампаніі пушчана ў сплаў па малых рэчках 104.000 кубамэтраў ці 75 проц. На галоўныя рэкі выплаўлена 70.000 кубамэтраў, якія ўжо прыбылі на канчатковыя пункты.

У Барысаўскім раёне з выплавачных рэчак пушчана ў сплаў 183.000 кубамэтраў ці 49 проц. На галоўныя рэкі выплаўлена 70.000 кубамэтраў, з якіх на канчатковыя пункты дастаўлена 31.000 кубамэтраў.

У Магілеўскім раёне зьвязаны ўвесь лес, а па рэках пушчана толькі 102.000 кубамэтраў ці 70 проц. Да 30 проц. гэтай колькасьці ўжо выйшла на галоўныя рэкі.

Мазырскі раён выплавіў па дробных рэчках 249.000 кубамэтраў, ці 100 проц. загатоўленага для сплаву лесу. На чыстыя рэкі сплаўлена 81.000 кубамэтраў і на канчатковыя пункты — 22.000 кбмт.

Віцебскі раён сплавіў 73.570 кбмт. ці 100 проц. загатоўленага лесу. На галоўныя рэкі выйшла 51.000 кбмт. і на канчатковыя пункты — 21.000 кубамэтраў.

У Полацкім раёне сплаўлена 120.000 кубамэтраў ці 68 проц. загатоўленага лесу. На чыстыя рэкі выйшла 25.000 кубамэтраў, на канчатковых пунктах атрымала 19.000 кбмт., або 12 проц. усяго загатоўленага.

У Чэрвеньскім раёне пушчана ў сплаў 89.000 кбмт. ці 73 проц. загатоўленага лесу. Да канчатковых пунктаў дастаўлена 37.000 кубамэтраў.

Вузьдзенскі раён сваё заданьне па сплаве выканаў поўнасьцю.

Паказаная вышэй зводка сьведчыць, што горш ад сплаву выконвае сплаўное заданьне Барысаўскі раён, які ўсяго выканаў 48 проц. свайго заданьня. Трэба памятаць, што Барысаўскі раён займае 25 проц. ва ўсёй сплаўной праграме, і дрэнны ход сплаву ў гэтым раёне адбіваецца на выкананьні ўсяго пляну сплаву. Да гэтага часу ў Барысаўскім раёне яшчэ не ўрэгулявана пытаньне з забесьпячэньнем сплаву патрэбнай рабочай сілай. На сёнешні дзень у раёне нехапае 2000 рабочых сплаўшчыкаў.

Адстаюць таксама Чэрвеньскі і Полацкі раёны, якія яшчэ не паказалі шпаркіх тэмпаў сплаву.

Кепска стаіць справа і ў Бабруйскім раёне, які за апошнюю дзесяцідзёнку выплавіў усяго 3.000 кубамэтраў.

Наогул трэба адзначыць, што сплаў па дробных рэчках амаль ва ўсіх раёнах зацягнуўся. На галоўныя сплаўныя рэкі лес у асноўным вышаў яшчэ ў вельмі малой колькасьці—гэта таксама сьведчыць аб слабых тэмпах работы сплаўных арганізацый.

Тэмпы сплаўной кампаніі павінны быць узмоцнены, інакш стварацца загроза, што сплаў свячасова ня будзе скончаны.

Арганізацыі на мясцох павінны не паслабляць увагі да сплаўное работы і дабіцца свячасовага і стопроцантнага выкананьня пляну сплаву.

А—с.

Рабочыя Магілева вітаюць ЦК партыі

Адбыўся пуск спробнай установкі магілеўскай фабрыкі штучнага валакна. У сувязі з гэтай урачыстасьцю рабочыя г. Магілева паслалі прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, у якіх адзначаюць, што толькі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і ня Ленінскага ЦК рабочая клясе Савецкага Саюзу пераможна будуе сацыялізм. Рабочыя Магілеўшчыны запэўняюць ЦК, што яны аддадуць усе свае сілы на выкананьне пяцігадовага пляну будаўніцтва за чатыры гады.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

АД ЦКК КП(б)Б

На пасяджэньні парттройкі ЦКК КП(б)Б у Менску 23-га мая ў 18½ гадз. будуць разглядацца справы:

Гдалевіча Якуба Давідавіча, **Узоха** Міны Сьцяпанавіча, **Глезінай** Доры Навумаўны, **Лявінсона** Тадора Ільліча, **Кізіна** Ягора Кузьміча, **Крывеня** Якава Пятровіча, **Сабліна** Сяргея Міхасёва, **Палачанкіна** Ісака Барысавіча, **Панасевіча** Васіля Лук'янавіча, **Комара** Мікалая Язэпавіча, **Папцянчыка** Алеся Андрэевіча, **Мандзеля** Бэнцяна Гіршавіча, **Рубіна** Ісака Ірмавіча, **Верына** Зьмітра Янкавіча, **Карабок** Вульфа Мэравіча, **Гольдзіна** Яўхіма Лейзаровіча, **Арцішэўскага** Казіміра Фэліксавіча, **Варановіча** Уладзімера Адамавіча, **Юшкевіча** Уладзімера Міхайлавіча, **Фядотава** Лаўрэна Васільлевіча, **Чалядзінскага** Янкі Пятровіча, **Кійойна** Ўры Гдалевіча, **Здановіча** Пятруся Пятрусёвага, **Шабуневіча** Алеся Карлавіча, **Шлома** Рыгора Гаўрылавіча і **Гладышова** Анатолія Сьцяпанавіча.

Усе гэтыя таварышы запрашаюцца прыняць удзел пры разглядзе іх спраў. Запрашаюцца таксама старшыні праверкомаў, дзе паказаныя таварышы праходзілі чыстку і сакратары ячэек, калі знаходзяцца ў Менску.

СЁНЬНЯ

У 19 гадз. у памяшканьні Кастр. РК КП(б)Б — дэлегацкі сход першай групы.

ВСНГБ. Агульны сход—працяг вечару крытыкі і самакрытыкі па пыт. аб рабоце апарату ВСНГ і аб чыстцы асабовага складу. Пач. у 19 гадз. у пам. ВСНГ. Запраш. рабочыя фабрык і заводаў, грамадзкія арганізацыі, гаспадарчыя прадпрыемствы і аб'яднаньні ВСНГ.

Дом Асьветы. Прызначаны на 14-га мая вечар памяці **Ўл. Маякоўскага** адкладваецца. Аб часе вечару будзе паведамлена дадаткова.

БДУ. Сэмінар. асьпірантаў-гісторыкаў адбудзецца ў 4-й аўд. прырод. корпусу. Пач. у 19 гадз. Запраш. асьпіранты камвузу, БАН і выкладчыкі-гісторыкі.

БДУ. (Стары будынак, актавая заля). У 20 гадз. агульны сход студэнтаў факультэту саўбуду і права. Парадак дня: выбары таварыскага суда і выб. дэлегатаў на канфэрэнцыю пралетстуду. Яўка студэнтаў абавязкова.

Пэдгабінэт. У 19 гадз. сход [illegible] важатых форп. гар. школ. На [illegible] дня — даклад тав. **Доўгаполаў** [illegible] ганізацыі гурткоў ваяўнічых [illegible] каў у школе і іх рабоце. Лука[illegible] ва.

ЗАЎТРА

Дом пісьменьніка. Менска[illegible] БелАПП'у склікае сход пач[illegible] пісьменьнікаў. На парадку дня [illegible] нізацыя цэнтр. літ. раб. гуртка. [illegible] пач. пісьменьнікі. Уваход воль[illegible] у 19 гадз.

Клюб друкароў. Вечар памяці **[illegible] якоўскага.** Увечары прымуць у[illegible] ларускія і яўрэйскія пісьмень[illegible] стацкую чытку твораў тав. **Ма[illegible] га** выканае Н. Г. **Волатава-С[illegible]** Пачатак у 18 з пал. гадз. Увах[illegible] даных білетах.

У чацьвер, 15 мая г. г., а 7-і[illegible] ўвечары, у памяшканьні Камву[illegible] вэрсытэцкая, 27) — вечар, пр[illegible] ны выпуску адзінай пар[illegible] Пасьля урач. часткі — канцэр[illegible]

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

Клюб чыгуначнікаў. У 18½ [illegible] чыстка апарату Белкаапсаюзу. [illegible] ку будуць праходзіць супрацоўн[illegible] рабсэкцыі. Запраш. рабочыя-чы[illegible] кі і рабоч. іншых прадпрыем[illegible] таксама супрацоўнікі каап. га[illegible] установу.

БАН. Пасядж. катэдры мар[illegible] ленінізму. Дакл. т. **Бабровіча** [illegible] «Сіраўкі Леніна з Р. Люксемб[illegible] самаазначэньні нацыі». Пач. у [illegible] Увах. вольны.

Навуковая асацыяцыя. 16-га [illegible] 20½ гадз. праф. **Эльбэрт** прач[illegible] радыё лекцыю для вучастковых [illegible] роў аб прыпчэпках.

— 19-га мая ў 19½ гадз. ра[illegible] цыя праф. **Бурака** аб ангіне.

Да ведама членаў саюзу Мэд[illegible] цы. Члены саюзу мэдсанпрацы [illegible] жадаюць паехаць у далёкія [illegible] (Крым, Каўказ, Урал) і блізкія [illegible] жах БССР) могуць запісацца [illegible] на ў біб-цы клюбу «Мэдсанпра[illegible] а 13 да 15-ці гадз. і з 19 да [illegible] Спраўкі там-жа.

Адказны рэдактар Ян. АСЬ[illegible]Ў.

ТАБЛІЦА 2-га тыражу выйгрышаў па бяспроцантва-выйгрышным выпуску 3-е дзяржаўнае ўнутр. выйгрышнае пазыкі індустрыялізацыі

№№ сэрый	№№ абл.	Сума	№№ сэрый	№№ абл.	Сума	№№ сэрый	№№ абл.	Сума	№№ сэрый	№№ абл.	Сума	№№ сэрый	№№ абл.	Сума	№№ сэрый	№№ абл.	Сума	№№ сэрый	№№ абл.	Сума	№№ сэрый	№№ абл.	Сума	№№ сэрый	№№ абл.	Сума
000087	1—10	200	009797	1—10	200	019974	1—10	200	030759	1—10	200	039980	1—10	200	052018	1—10	200	061725	1—10	200	071085	1—10	200	081094	1—10	200
000204	1—10	200	010033	1—10	200	020230	1—10	200	030770	1—10	200	040343	1—10	200	052167	1—10	200	061953	1—10	200	071357	04*)	1000	081415	1—10	200
000457	1—10	200	010399	1—10	200	020512	1—10	200	030869	1—10	200	040618	1—10	200	052289	1—10	200	062136	1—10	200	071398	1—10	200	081416	1—10	200
001015	1—10	200	010821	1—10	200	020774	1—10	200	030897	1—10	200	040825	1—10	200	052447	1—10	200	062275	1—10	200	071914	1—10	200	081478	1—10	200
001064	1—10	200	010835	1—10	200	021112	1—10	200	031119	1—10	200	040826	1—10	200	052311	1—10	200	062321	1—10	200	072006	1—10	200	081701	1—10	200
001806	1—10	200	010870	1—10	200	021255	1—10	200	031434	1—10	200	040992	1—10	200	052468	1—10	200	062759	1—10	200	072278	1—10	200	081971	1—10	200
001324	1—10	200	010933	1—10	200	021261	1—10	200	031923	1—10	200	041445	1—10	200	052548	1—10	200	062808	1—10	200	072582	1—10	200	082046	1—10	200
001852	1—10	200	011171	10*)	1000	021511	1—10	200	031945	1—10	200	041558	1—10	200	052575	1—10	200	062970	1—10	200	072931	1—10	200	082385	1—10	200
002013	1—10	200	011465	1—10	200	021625	1—10	200	031982	1—10	200	041638	1—10	200	052958	1—10	200	063211	1—10	200	072971	1—10	200	082641	1—10	200
002164	1—10	200	012088	1—10	200	022007	1—10	200	032001	1—10	200	042282	1—10	200	052966	1—10	200	063239	1—10	200	073035	1—10	200	083038	1—10	200
002185	1—10	200	012421	1—10	200	022257	1—10	200	032010	1—10	200	042329	1—10	200	053170	1—10	200	063602	1—10	200	073300	1—10	200	083096	1—10	200
002362	1—10	200	012806	1—10	200	022439	1—10	200	032355	1—10	200	042431	09*)	1000	053547	1—10	200	063655	1—10	200	073497	1—10	200	083207	1—10	200
002445	1—10	200	012972	1—10	200	022701	1—10	200	032381	1—10	200	042484	1—10	200	053951	1—10	200	064372	1—10	200	073529	1—10	200	083499	1—10	200
002564	1—10	200	013001	1—10	200	022900	1—10	200	032435	1—10	200	042652	1—10	200	054426	1—10	200	064381	1—10	200	073751	1—10	200	083557	1—10	200
002567	1—10	200	013055	1—10	200	022965	1—10	200	032590	1—10	200	042829	1—10	200	055053	1—10	200	064467	1—10	200	074069	1—10	200	083842	1—10	200
002787	1—10	200	013411	1—10	200	023240	1—10	200	033173	1—10	200	043051	1—10	200	055219	1—10	200	064527	1—10	200	074147	1—10	200	084257	1—10	200
003101	1—10	200	013438	1—10	200	023275	1—10	200	033396	1—10	200	043119	1—10	200	055444	1—10	200	064907	1—10	200	074219	1—10	200	084576	1—10	200
003225	1—10	200	013731	1—10	200	023449	1—10	200	033678	1—10	200	043176	1—10	200	055537	1—10	200	064910	1—10	200	074347	1—10	200	084626	1—10	200
003465	1—10	200	013819	1—10	200	023524	1—10	200	033726	1—10	200	043496	1—10	200	055610	1—10	200	064918	1—10	200	074653	1—10	200	084946	1—10	200
003630	1—10	200	014468	08*)	5000	023993	1—10	200	034128	1—10	200	043531	1—10	200	055620	1—10	200	064927	1—10	200	074719	1—10	200	084983	1—10	200
003920	1—10	200	014533	1—10	200	024444	1—10	200	034512	1—10	200	043871	1—10	200	055653	1—10	200	065019	1—10	200	075119	1—10	200	084986	1—10	200
003949	1—10	200	014548	1—10	200	024454	1—10	200	034768	1—10	200	043875	1—10	200	055801	1—10	200	065099	1—10	200	075212	1—10	200	085120	1—10	200
004103	1—10	200	014646	1—10	200	024564	03*)	5000	034795	1—10	200	044046	1—10	200	055883	1—10	200	065248	1—10	200	075473	1—10	200	085297	1—10	200
004561	1—10	200	014688	1—10	200	024584	1—10	200	035010	1—10	200	044163	1—10	200	056266	1—10	200	065829	08*)	1000	075682	1—10	200	085300	1—10	200
004706	1—10	200	014731	1—10	200	024780	1—10	200	035111	1—10	200	044442	04*)	1000	056472	1—10	200	065994	1—10	200	075737	1—10	200	085364	1—10	200
004763	1—10	200	014836	1—10	200	025472	1—10	200	035336	1—10	200	045052	1—10	200	056902	1—10	200	066264	1—10	200	075792	1—10	200	085572	1—10	200
005082	1—10	200	015056	1—10	200	025531	1—10	200	035608	1—10	200	045184	1—10	200	056934	1—10	200	066281	1—10	200	075933	1—10	200	085815	1—10	200
005177	1—10	200	015272	1—10	200	025617	1—10	200	035655	07*)	1000	046504	1—10	200	056980	1—10	200	066778	1—10	200	076046	1—10	200	085833	1—10	200
005266	09*)	1000	015416	1—10	200	026050	1—10	200	036009	1—10	200	046531	1—10	200	056993	1—10	200	067008	1—10	200	076525	1—10	200	085951	1—10	200
005390	1—10	200	015711	1—10	200	026157	1—10	200	036115	1—10	200	046582	1—10	200	057687	1—10	200	067171	05*)	1000	076542	1—10	200	085992	1—10	200
005432	1—10	200	015965	1—10	200	026480	1—10	200	036198	1—10	200	046699	1—10	200	057702	1—10	200	067271	06*)	1000	076855	1—10	200	086162	1—10	200
005442	1—10	200	016003	1—10	200	026533	1—10	200	036350	1—10	200	046821	1—10	200	057760	1—10	200	067284	1—10	200	077155	1—10	200	086314	07*)	1000
005595	1—10	200	016019	1—10	200	026703	1—10	200	036401	1—10	200	046866	1—10	200	057831	1—10	200	067359	1—10	200	077217	1—10	200	086438	1—10	200
005789	1—10	200	016318	1—10	200	027139	1—10	200	036474	1—10	200	046954	1—10	200	058144	1—10	200	067489	1—10	200	077331	1—10	200	086487	1—10	200
005811	06*)	1000	016652	1—10	200	027150	1—10	200	036544	1—10	200	047055	1—10	200	058197	1—10	200	067519	1—10	200	077415	1—10	200	086524	1—10	200
005948	1—10	200	016683	1—10	200	027246	1—10	200	036712	1—10	200	047168	1—10	200	058239	1—10	200	067687	1—10	200	077810	1—10	200	086565	1—10	200
006146	1—10	200	016742	1—10	200	027295	1—10	200	036909	1—10	200	047253	1—10	200	058319	1—10	200	067885	1—10	200	077874	1—10	200	086725	1—10	200
006159	1—10	200	016799	1—10	200	027334	1—10	200	036948	1—10	200	047581	1—10	200	058518	1—10	200	067912	1—10	200	078030	1—10	200	086770	1—10	200
006334	1—10	200	016917	1—10	200	027399	1—10	200	037025	1—10	200	047674	1—10	200	058685	1—10	200	068293	01*)	1000	078171	1—10	200	086773	1—10	200
006766	1—10	200	016961	1—10	200	027551	1—10	200	037055	1—10	200	047747	1—10	200	058864	1—10	200	068348	1—10	200	078459	1—10	200	086805	1—10	200
006795	1—10	200	017191	1—10	200	027706	1—10	200	037165	1—10	200	047845	1—10	200	058998	1—10	200	068516	1—10	200	078627	1—10	200	086938	1—10	200
006995	1—10	200	017235	1—10	200	028066	1—10	200	037499	1—10	200	048067	1—10	200	059095	1—10	200	068624	1—10	200	078668	1—10	200	087144	1—10	200
007003	1—10	200	017276	1—10	200	028120	1—10	200	037730	1—10	200	048332	1—10	200	059251	1—10	200	068687	1—10	200	078749	1—10	200	087158	1—10	200
007059	1—10	200	017515	1—10	200	028212	1—10	200	037752	1—10	200	048707	1—10	200	059319	1—10	200	068725	1—10	200	079031	1—10	200	087279	03*)	1000
007639	1—10	200	017381	1—10	200	028237	1—10	200	037979	1—10	200	048745	1—10	200	059485	1—10	200	068759	1—10	200	079168	1—10	200	087510	1—10	200
007707	1—10	200	017968	1—10	200	028670	1—10	200	038564	1—10	200	048767	1—10	200	059531	1—10	200	068804	1—10	200	079205	1—10	200	087987	1—10	200
008148	1—10	200	018016	1—10	200	028781	1—10	200	038939	06*)	1000	048846	1—10	200	059654	1—10	200	068807	1—10	200	079269	1—10	200	088125	1—10	200
008664	1—10	200	018069	1—10	200	028919	1—10	200	039012	1—10	200	048921	1—10	200	059750	1—10	200	068948	1—10	200	079341	1—10	200	088510	1—10	200
008705	1—10	200	018119	1—10	200	028952	1—10	200	039046	03*)	1000	049104	1—10	200	059899	1—10	200	069021	1—10	200	079346	1—10	200	088855	1—10	200
008708	1—10	200	018250	1—10	200	028982	1—10	200	039097	1—10	200	049192	1—10	200	059996	1—10	200	069180	1—10	200	079392	1—10	200	089263	1—10	200
008744	1—10	200	018344	1—10	200	029276	1—10	200	039275	1—10	200	049241	1—10	200	060073	1—10	200	069513	1—10	200	079574	1—10	200	089269	1—10	200
009064	1—10	200	018564	1—10	200	029367	1—10	200	039287	1—10	200	049493	1—10	200	060175	1—10	200	069765	1—10	200	079732	1—10	200	089538	1—10	200
009143	1—10	200	018755	1—10	200	029376	1—10	200	039409	1—10	200	049711	1—10	200	060265	1—10	200	070061	1—10	200	080069	1—10	200	089580	1—10	200
009333	1—10	200	019263	1—10	200	029477	1—10	200	039556	1—10	200	049732	1—10	200	060399	10*)	1000	070287	1—10	200	080172	1—10	200	089743	1—10	200
009483	1—10	200	019439	1—10	200	029639	1—10	200	039771	1—10	200	049748